Кватэрнае пытанне

## ЧАРГА ЗАХАВАЕЦЦА

***Вось ужо 10 гадоў па месцы працы я стаю ў чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў, але баюся, што гэта марна, бо цяпер у нас усё часцей сталі гаварыць пра скарачэнне штату. Што тады будзе з маёю чаргой? Няўжо прападзе?***

**Л.Г.**, *Гомельская вобл.*

Пунктамі 34.6, 35 і 36 Палажэння аб парадку ўліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, прадастаўлення жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду (зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 лістапада 2005 г. № 565) вызначана, у прыватнасці, што права знаходзіцца на ўліку асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў па месцы працы (службы) захоўваецца за грамадзянамі ў выпадках:

звальнення ў сувязі са скарачэннем колькасці або штату работнікаў — да даты працаўладкавання ў іншую арганізацыю. Пры працаўладкаванні на новае месца працы (службы) грамадзянін прымаецца на ўлік асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў (калі такі ўлік у арганізацыі вядзецца) з часу пастаноўкі яго на ўлік па ранейшым месцы працы (службы) з захаваннем умоў пастаноўкі на ўлік, якія дзейнічаюць у гэтай арганізацыі;

пры пераводзе грамадзяніна, які знаходзіцца на ўліку асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, на працу (службу) у іншы дзяржаўны орган, іншую арганізацыю, у якіх вядзецца гэты ўлік, ён прымаецца на ўлік асобай з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў па новым месцы працы (службы) з часу прыняцця яго на ўлік па ранейшым месцы працы (службы).

Што датычыцца рэарганізацыі дзяржаўнага органа, іншай арганізацыі, то грамадзяне, якія знаходзяцца на ўліку асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, прымаюцца на такі ўлік па новым месцы працы (службы) у рэарганізаваным дзяржаўным органе, іншай арганізацыі таксама з часу прыняцця на ўлік па ранейшым месцы працы (службы).

**Віктар САВІЦКІ.**

### ТРАШЧАЦЬ ДАЧЫ

**Садова-агародныя таварыствы рэдка хто з дачнікаў восенню-зімой наведвае. І гэта, як кажуць, на руку зладзеям. Адтуль яны цягнуць усё, што з'яўляецца нейкай каштоўнасцю.**

Так, з дачнага доміка жыхаркі Рагачова, што знаходзіцца ў вёсцы Мінькоў, зніклі алюмініевыя ёмістасці, тры лыжкі і электрачайнік. Пенсіянерка з Мазыра, прыехаўшы на сваю дачу ў вёску Баравікі, не ўбачыла там свайго тэлевізара «Сапфір». Не знайшла на дачы тэлевізар «Віцязь» і жыхарка Рагачова, які ўкраў з узломам дзвярэй 28-гадовы раней судзімы работнік СВК «Высокае». Ён пасля заявы ў міліцыю быў арыштаваны.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

# ТАЯМНІЧЫЯ СЛЯДЫ ГАРАДЗЕНСКІХ ХРАМАЎ

## Дзе захоўваецца цудатворная ікона Каложскай Багародзіцы?

**Пасля ўмацавання нёманскага берага, на якім стаіць Барыса-Глебская (Каложская) царква, новыя апоўзні, на думку спецыялістаў, выключаны. І ўжо ў наступным годзе можа распачацца другі, не менш важны этап — рэстаўрацыя храма, у выніку якой гэта жамчужына праваслаўнага дойлідства павінна набыць сваё аблічча ў параметрах канца XVIII — сярэдзіны XIX стагоддзя.**

**Спрэчкі наконт канцэпцыі аднаўлення Каложы, як сведчыць нядаўні «круглы стол» у Гродне, працягваюцца. У прыватнасці, ёсць меркаванне, што недапушчальна, каб асобныя часткі храма падчас рэканструкцыі былі выкананы на ўзор розных эпох. І, безумоўна, хацелася б, каб рэстаўрацыя садзейнічала як мага больш поўнаму падабенству з творам старажытных дойлідаў. Але вось загадка: як выглядала Барыса-Глебская (Каложская) царква ў XVII стагоддзі? Адпаведных малюнкаў і чарцяжоў не захавалася. А калі так, то якому варыянту аддаць перавагу: паклапаціцца аб захаванні таго, што засталося? Альбо аднавіць разбураныя часткі храма паводле няхай больш позніх, але рэальных гістарычных матэрыялаў, захаваўшы існуючыя аўтэнтычныя фрагменты?**

**Выбар, верагодна, будзе зроблены ўжо ў бліжэйшы час. А вось над іншымі загадкамі і Каложы, і іншых гарадзенскіх храмаў давядзецца, мусіць, працаваць не толькі цяперашнім, але і будучым пакаленням даследчыкаў.**

**Ніжняя, Верхняя, Малая, Васкрасенская, Прачысценская...**

Для пераважнай часткі жыхароў горада над Нёманам ды і яго гасцей перыяд праваслаўнага дойлідства XII стагоддзя атаясамліваецца, бадай, толькі з Барыса-Глебскай (Каложскай) царквой. Так, Каложа — гэта адзіны храм, які хоць і не поўнасцю, але захаваўся з таго часу да нашых дзён. Аднак, паводле гістарычных і археалагічных звестак, у XII стагоддзі ў Гродне былі ажно чатыры каменныя царквы. І гэта — у маленькім горадзе, дзе пражывала не больш за паўтары тысячы чалавек. Чым тлумачыцца гэты феномен?

На думку Ігара Трусава, аўтара нядаўна выдадзенай кнігі «Праваслаўныя храмы Гродна», гэта сведчыць аб тым, што горад з'яўляўся не толькі ўсходнеславянскім вайсковым фарпостам на мяжы з заходнеславянскімі і балцкімі плямёнамі, але і своеасаблівым фарпостам праваслаўя на гэтых землях. І ўжо ў XII стагоддзі ў Гродне склалася ўнікальная архітэктурна-мастацкая школа. У складзе арцелі пад кіраўніцтвам Пятра Міланега былі, акрамя архітэктара і будаўнікоў, іканапісцы, ювеліры, сталяры-чырвонадрэўшчыкі, майстры па кераміцы і апрацоўцы каменю, ліцейшчыкі. Для будаўніцтва храмаў сяляне навакольных вёсак выраблялі цэглу-плінфу, пазначаючы асобныя экзэмпляры кожный партыі сваімі радавымі знакамі. Гэта і старажытныя піктаграмы, і больш позняя славянскія альбо балцкія руны, і сучасная для XII стагоддзя праваслаўная кірыліца. Такія знакі ў пушчах вакол горада на борцях (вуллях для дзікіх пчолаў) гродзенскіх сялян захоўваліся ажно да XVIII стагоддзя.

Па храналогіі будаўніцтва першынцам Гродзенскай архітэктурнай школы XII стагоддзя спецыялісты лічаць не Каложскую, а так званую Ніжнюю царкву, якая была размешчана на тэрыторыі ўмацаванага горада. Верагодна, яна з самага пачатку выконвала функцыі храма для князя, членаў яго сям'і і воінаў-дружыннікаў. Руіны Ніжняй царквы былі выяўлены Юзэфам Ядкоўскім падчас раскопак на тэрыторыі Старога замка ў 1932—1933 гадах. Гэта быў шасцістоўпны храм 16,8х11,6 м з трыма апсідамі, дзве з якіх былі ў тоўшчы сцен. У сценах меліся шматлікія адтуліны галаснікоў. Фасады царквы ўпрыгожваліся маёлікавымі пліткамі рознай формы, паліўнымі круглымі блюдамі, шліфаванымі камянямі. З маёлікавых пліт была і падлога, а дах і купалы былі пакрытыя лістамі тонка раскатанага свінцу. Драўляны іканастас быў упрыгожаны шматлікімі меднымі пласцінамі. Падчас раскопак знойдзены рэшткі колакала і царкоўных рэчаў.

Руіны Ніжняй царквы цяпер экспануюцца Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеем. Але ж была яшчэ і царква, якую даследчыкі ўмоўна называюць Верхняй. Руіны гэтага, пабудаванага ў гатычным стылі храма былі таксама выяўлены Юзэфам Ядкоўскім падчас раскопак на Старым замку. Верхняя царква з'ўлялася невялікай капліцай памерам 8,9х8,9 м. Ініцыятарам яе будаўніцтва, лічыць Ігар Трусаў, мог стаць князь Давыд Гарадзенскі, які ў дзяцінстве і юнацтве выхоўваўся ў Пскове ў моцнай праваслаўнай традыцыі.

Наступны па храналогіі будаўніцтва гродзенскі храм XII стагоддзя — гэта царква на ўмацаваным пасадзе, сучаснай тэрыторыі Нова-



Паштоўка з выявай Аляксандра-Неўскай царквы, разбуранай у 1938 годзе.

вага замка. Большасць даследчыкаў атаясамлівае яе з Васкрасенскай царквой, якая згадваецца ў больш позніх дакументах і, мажліва, адлюстравана ў знакамітай гравюры Цюндта Адэльгаўзера 1568 года.

Рэшткі гэтага храма па сённяшні не знойдзены. Ёсць для маладых археолагаў у Гродне і іншыя задачы. У прыватнасці, хто паспрабуе адшукаць сляды Малой, Траецкай, Мікалаеўскай праваслаўных цэркваў, а таксама, мажліва, Чэснахрышчэнскай царквы і капліцы на Падоле? А сённяшнім і новым пакаленням гісторыкаў, не выключана, пашанцуе знайсці новыя архіўныя крыніцы па гэтай тэме, а можа нават і сляды такіх таямнічых гродзенскіх цэркваў, як Сімяонаўская (альбо Спаская) і Ілліі Прарока.

Шанцы на новыя адкрыцці, верыць Ігар Трусаў, ёсць. Але толькі тады, калі культурны слой горада не будзе знішчацца без навуковай, археалагічнай і гістарычнай фіксацыі. Павінна стаць нормай, што ў гістарычных мясцінах спачатку працуюць даследчыкі нашай мінуўшчыны і ўжо пасля іх праводзіцца будаўніцтва і добраўпарадкаванне.

І ўсё ж большасць загадак гісторыі гарадзенскіх храмаў звязана, безумоўна, з Барыса-Глебскай (Каложскай) царквой. Вось толькі некаторыя з іх.

**КАЛОЖАНЬ, КАЛОЗЕНЬ, КАЛОЖА...**

У літаратуры па гісторыі Барыса-Глебскай царквы традыцыйна прыводзіцца летапісны факт аб тым, што князь Вітаўт спустошыў пасад Пскова пад назвай Каложэ і пасяліў пад Гродна 11 тысяч палонных. Аднак пацвярджэння таго, што палонныя атрымалі менавіта гродзенскую «прапіску», у гістарычных крыніцах адшукаць не ўдалося.



Пласціна з раслінным арнаментам алтара Ніжняй царквы.

Версія Ігара Трусава такая. Каложань альбо Каложэнь — гэта тутэйшая, славянская назва незаселенай мясцовасці, хутчэй за ўсё, урочышча, якая не мае дачынення да паходу Вітаўта на Пскоўскую зямлю. Можна дапусціць, што гэта ўрочышча было нечым асаблівым. Этымалогія назвы Каложань, Каложэнь (як, зрэшты, і пскоўскага прыгарада Каложэ) ідзе ад такіх старажытнарускіх слоў, як «калода» — вадапойнае карыта, пчаліны вулей, магіла «кладзеж», «калозень» — крыніца з вадой. Такім чынам, Каложань, Калозень — гэта, верагодна, урочышча, дзе былі магутныя крыніцы, пчальнік альбо магілы. Старажытныя славяне надавалі вялікую ўвагу такім месцам з сакральным значэннем.

Яшчэ адна загадка: з чым звязаны некаторы перакос Барыса-Глебскай царквы, неперпендыкулярнасць сценаў? На думку навуковага кіраўніка праекта рэстаўрацыі храма Генадзя Лаўрэцкага, гэта не можа ўспрымацца як нядбайнасць, недакладнасць старажытных дойлідаў. Выдатная якасць будаўнічых работ выключае чалавечы фактар, тым больш што дойлідам было няцяжка пабудаваць правільны прамы вугал з дапамогай «егіпецкага трохвугольніка» ці засечак. Да таго ж, паралельны аналіз з грэчаскімі і балгарскімі помнікамі архітэктурнай школы, якая аказала ўплыў на Каложскі храм, сведчыць, што яны таксама маюць падобны перакос.



Барыса-Глебская (Каложская) царква.

Такім чынам, лічыць Генадзь Лаўрэцкі, перакос быў звязаны з сімволіка-арыенціровачным прынцыпам, якім кіраваліся дойліды, з семантыкай святла, якая была ўласцівая хрысціянскаму мастацтву. На працягу года сонца ўзыходзіць з-за гарызонта на значнай частцы ўсходняга паўшар'я: ад летняга сонцастаяння на паўночным усходзе да зімовага — на паўднёвым усходзе. У той жа час, знаходзячыся ў зеніце, сонца мае нязменны азімут. І калі прыняць гіпотэзу аб разбіўцы падоўжнай восі ў момант усходу сонца, а папярочнай — у момант яго зеніту, то становіцца зразумелай прычына перакосу.

У архівах Расіі, Украіны, Літвы, Польшчы, Германіі, Швецыі, Францыі, ЗША, Вялікабрытаніі і іншых краін ёсць дакументы, якія дазволяць праліць новае святло на гісторыю гродзенскіх праваслаўных храмаў і прыходаў. Ігар Трусаў лічыць таксама неабходным прадоўжыць і работу ў архівах па праблеме эвакуацыі царкоўных каштоўнасцяў з Гродна падчас Першай сусветнай вайны і пошуку гэтых рарытэтаў. Тады можа з'явіцца шанц знайсці і вярнуць у горад над Нёманам цудатворную ікону Каложскай Багародзіцы, якая не з'яўляецца значнай каштоўнасцю для замежных музеяў, аднак бясцэнная для гродзенскіх вернікаў.

Паводле легенды, гэту ікону заўсёды насіў з сабой жабрак, які з набліжэннем смерці перадаў яе ў Барыса-Глебскі храм. І завяшчаў пахаваць яго каля Каложы, што і было выканана. Епіскап Іосіф Сакалоў дае дакладнае апісанне гэтай іконы: «Яна пісана на меднай дошцы, вышынёй 5, шырынёй 4 вяршкі (17 на 22 см), змешчана ў кіпарысавую дошку, рыза на ёй срэбрапазлашчаная 84-й пробы, вянцы ўпрыгожаны 14 гранатамі, устаўленымі ў сярэбраныя гнёзды. Вянцы і палі чаканныя, на палях адмыслова тонкім разцом выразаны старазапаветныя праобразавальныя выявы, што адносяцца да твару Багамацеры, і паміж імі 8 камянёў — 2 гранаты, 5 сердалікаў і агат. На святой іконе і каля яе па полю мноства розных прывесак, уся яна апраўлена гранатамі з залатымі буйнымі зярнятамі — да 45 на ланцужку».

Каложскі цудатворны абраз Багародзіцы лічыцца заступнікам Гродна. Захаваліся датаваныя канцом XIX — пачаткам XX стагоддзя сведчанні людзей, што яны сталі адчуваць сябе лепш пасля малітвы перад гэтай іконай. Аднак у 1915 яна была вывезена з горада і па сёння месцазнаходжанне гэтай гродзенскай святыні невядома. Няма яе, згодна з адказамі на запыты, ні ў Траццякоўскай галерэі, ні ў Гістарычным і іншых маскоўскіх музеях. Не выключана, што яна знаходзіцца ў прыватнай калекцыі, але варта і прадоўжыць яе пошук у іншых музеях, прычым, не толькі расійскіх.

...Некалькі гадоў таму свайму беларускаму пабрацімю вырашылі дапамагчы ў падмаскоўных Хімках. Адміністрацыя гэтага горада заказала выраб абраза паводле іконы Каложскай Багародзіцы ў лепшай расійскай іканапіснай майстэрні, асвечанай Патрыярхам Маскоўскім і ўсяе Русі Аляксіем II. І цяпер гэта ікона, у футляры з чырвонага дрэва, знаходзіцца ў Барыса-Глебскай (Каложскай) царкве.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
**Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.**




# Пенсія шматдзетнай маці

**У маёй мамы пяцёра дзяцей, ёй 48 гадоў. Малодшаму дзіцяці ў студзені споўніцца 15 гадоў. Я чула, што маці, якія нарадзілі пяцёра дзяцей, могуць пайсці на пенсію, калі малодшаму споўніцца 16 гадоў. Ці так гэта?**

**Ганна,** *Брэсцкая вобласць.*

Права на пенсію па ўзросце на агульных падставах у адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб пенсійным забеспячэнні» маюць мужчыны пры дасягненні імі ўзросту 60 гадоў і пры стажы работы не менш як 25 гадоў, жанчыны — пры дасягненні 55 гадоў і пры стажы работы не менш як 20 гадоў.

Разам з тым артыкулам 19 вышэйназванага Закона ўстаноўлена, што шматдзетныя маці, якія нарадзілі пяцёра і больш дзяцей і выхавалі іх да 8-гадовага ўзросту, маюць права на пенсію па ўзросце па дасягненні 50 гадоў (а таксама жанчыны, у якіх да гэтага часу пятае дзіця не дасягнула 8 гадоў) і пры стажы работы не менш як 15 гадоў.

Жанчыны, якія нарадзілі пяцёра і больш дзяцей і выхавалі іх да 16-гадовага ўзросту, пры стажы работы ў калгасах, саўгасах і іншых прадпрыемствах сельскай гаспадаркі непасрэдна ў вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі не менш як 10 гадоў (без заліку ў стаж работы часу догляду дзяцей) маюць права на пенсію незалежна ад узросту.

Нечаканы дыялог

# Сяргей ІВАНОЎ: «А чаму ж вы, грамадзянка Іванова, НЕ ПАТЭЛЕФАНАВАЛІ ПА 102?»

**Пра вулічны алкагалізм і іншыя негатыўныя праявы гэтай сацыяльнай хваробы з намеснікам начальніка УУС Магілёўскага аблвыканкама Сяргеем ІВАНОВЫМ гутарыць карэспандэнт «Звязды».**

***— Нядаўна праходзіла праз двары на адным з магілёўскіх мікрараёнаў і на свае вочы ўпэўнілася, што вулічны алкагалізм — актуальная праблема. Мужчыны сталага ўзросту за вуглом крамы раскаркавалі бутэльку таннага віна, а кампанія прыстойных на выгляд маладых людзей без сарамлівасці расклала на пяньку гарэлку з закускай. Як вы ставіцеся да вулічнага алкагалізму, Сяргей Барысавіч?***

— Вядома ж, адмоўна. А вы?

***— І я таксама адмоўна.***

— А чаму ж вы, грамадзянка Іванова, не патэлефанавалі па нумары 102? Дзе ваша грамадзянскае сумленне? Распіццё алкагольных напояў у грамадскім месцы — гэта адміністрацыйнае правапарушэнне, якое прадугледжвае штраф да 8 базавых велічыняў. За 11 месяцаў у Магілёўскай вобласці за распіццё і з'яўленне ў грамадскіх месцах у п'яным стане прыцягнута да адміністрацыйнай адказнасці амаль 22,5 тысячы чалавек.

***— Лічба, якая ўражвае.***

— Гэта на некалькі тысяч болей, чым летась. А з вуліц і іншых грамадскіх месцаў забралі і змясцілі ў медыцынскі выцвярэзнік амаль 11 тысяч чалавек. І, зразумела, трэба прымаць экстранныя меры, калі ў дварах пачынаюць піць нармальныя з выгляду людзі. Вось каго вы сабе ўяўляеце, калі пра чалавека гавораць, што ён п'е па завуголлях? Няголены твар...

***— ... брудны паўкажушок са скатанай штучнай футры савецкага ўзору і гэтак далей. Бамжы, асацыяльныя асобы, прафесійныя алкаголікі.***

— Так. А для нармальных людзей у нас працуе шырокая сетка разнастайных піцейных устаноў — на любы кашалёк і густ. Хоць мы маніторынг не рабілі, ці сапраўды павялічылася колькасць прыстойных людзей, якія распіваюць спіртныя напоі ў грамадскіх месцах.

***— Але менавіта такое ўражанне складваецца, асабліва ў святы і выхадныя дні, якіх наперадзе ў нас багата. Вы ведаеце, што жыхары дамоў у цэнтры Магілёва патрабуюць ліквідаваць альтанкі і лаўкі ў дварах, таму што іх акупавалі ахвотнікі выпіць і закусіць? І няхай самім сядзець і дыхаць свежым паветрам няма на чым, але яшчэ горш — апоўначы слухаць п'яныя крыкі.***

— Ведаю, таму што такія заявы паступалі і да нас. Мы іх перадавалі ўладам, а са свайго боку бяром такія скаргі на кантроль патрульна-паставой службы. Безумоўна, трэба змагацца з такімі праявамі. Можа, гэта прыватная справа, калі чалавек «зашыўся» ў сваёй кватэры і п'е. Але зусім іншая, калі ўсё гэта робіцца на людзях, з агрэсіўнай дэманстратыўнасцю: маўляў, мы тут п'ём — і ніхто нам не ўказ. А калі якая бабулька асмеліцца зрабіць заўвагу, дык ёй яшчэ і нагрубяць. Ды дзеці не могуць падысці да «грыбка», бо там сядзяць п'яніцы. Вось гэта мы будзем спыняць рашуча.

Але яшчэ больш мяне непакоіць моладзь, якая распівае алкагольныя напоі дзе заўгодна. Гэта коле вочы. І ўсё пачынаецца з піва, якое стала модай.

***— Вы не любіце піва?***

— Я не супраць куфля беларускага піва ў вольны час. Але ўсё ў межах разумнага. Усе беды ад перабору і перахлёсту, у любой сітуацыі. Здавён кажуць праўду: усё добра ў меру.

***— Чаму ж, на ваш погляд, няма меры ў нашай моладзі?***

— Упусцілі нешта ў выхаванні. Міліцыя, вядома, працуе на прафілактыку і імкнецца не дапусціць правапарушэнняў, аднак маладыя людзі трапляюць у поле нашай увагі ўжо ў свядомым узросце. Позна ім чытаць лекцыі пра тое, што піць — гэта нядобра і непрыгожа. У гэтым трэба пераконваць малых з дзіцячага садка і далей, на ўсіх прыступках да сталасці. А цяпер самае галоўнае — скасаваць папулярнасць піва ў моладзевым асяроддзі.

***— А як гэта зрабіць?***

— Не ведаю. Аднак я памятаю сваю маладосць: у мяне нават думкі ніколі не было набыць бутэльку піва, ісці па вуліцы і сёрбаць. А калі ўжываць піва без меры, то наступная думка — ад гарэлкі болей кайфу. Так што я спадзяюся, што парламент новага склікання зоймецца законам аб забароне распіцця піва ў грамадскіх месцах.

***— Магілёўскі гарадскі Савет дэпутатаў прыняў такое рэкамендацыйнае рашэнне, і яго абяцалі падтрымаць абраныя ў абласным цэнтры дэпутаты Палаты прадстаўнікоў. Аднак пакуль да піва на вуліцы, здаецца, лаяльна ставіцца грамадства. Ніхто не кранае кампаніі маладых людзей, калі яны з півам адпачываюць на лаўках, рагочуць і лаюцца, на той жа пешаходнай вуліцы Ленінскай. І нарад міліцыі можа прайсці міма.***

— А гэта няпраўда. Калі толькі я даведаюся, што міліцыянер прайшоў міма і не зрабіў заўвагі, я накладу на яго спагнанне. Я не хачу казаць, што трэба выклікаць «варанок», хапаць усіх і складаць пратаколы. Але зрабіць заўвагу — гэта абавязкова.

***— А вы самі робіце такія заўвагі?***

— Я ніколі не праходжу міма. Часта езджу, напрыклад, міма медыцынскага вучылішча і спыняюся каля дзяўчат, якія кураць на вуліцы. Я гутару з імі і не сустракаю супрацьдзеяння.

***— Вам, таварыш палкоўнік, пераканаўчай упэўненасці надае табельная зброя.***

— Якая зброя? Безумоўна, міліцэйская форма схіляе да спакойнай гутаркі. Але і ў цывільным я не праходжу супраць няправільных сітуацый. Ну часам проста злосць бярэ!

У нас быў фестываль «Магілёўская вобласць — тэрыторыя здароўя». Я выйшаў з Палаца культуры пад уражаннем, як шмат робіцца ў нашай краіне для здаровага ладу жыцця. Трымаю пад пахай грамату за ўклад міліцыі ў агульную справу. А на ганку моладзь курыць! І я іх шугануў і абяцаў вушы паабрываць. І тады падумаў, як бы іншым разам не нарвацца...



Але нельга жыць з псіхалогіяй «Мая хата з краю»: калі хочаш, каб навокал было добра, выпадае пра гэта клапаціцца. Трэба да ўсяго мець справу — бо яна можа датычыцца ўласна цябе і тваёй сям'і.

***— Я прымаю заўвагу. А як вы сёння ўвогуле ацэньваеце свядомасць грамадства? Тэлефануюць у міліцыю неабыякавыя людзі?***

— Напрыклад, на «гарачую лінію» пра самагонаварэнне і сурагатны алкаголь нам сёлета патэлефанавалі каля 800 чалавек. Гэта праблема: сёлета памерлі ад алкагольнага атручэння 350 чалавек! Праўда, мы ўжо моцна прыціснулі самагоншчыкаў і нелегальных прадаўцоў алкагольных вадкасцяў, але цяпер даводзіцца змагацца з тымі, хто набывае ў крамах «чарніла» і ўначы гандлюе ім.

Гэта праца нялёгкая. Раней наш супрацоўнік некалькі дзён не галіўся, потым апранаўся ў прастака, і група ехала на раён. Наш «агент» патаўчэцца ў краме і высветліць у мужчын, што набыць можна ў Мані. Ён робіць кантрольны закуп, і пункт ліквідуецца. Аднак цяпер прадаюць толькі сваім, і няголеным міліцыянерам тут не абыдзешся. Але сёлета мы канфіскавалі больш за 70 тысяч літраў самагону і каля 40 тысяч літраў спірту.

***— Якія жорсткія спагнанні ні накладалі б на нелегальных гандляроў алкаголем, іх, відаць, поўнасцю не вынішчыць. Бо гэта прыбытковы бізнэс. Затое я ніяк не магу зразумець, чаму людзі садзяцца за руль п'янымі. Гэта ж небяспека для цябе самога і іншых людзей!***

— Гэта з псіхалогіі — праслаўтае «А можа, наўдалую...». Мы актывізавалі працу ў дачыненні да п'яных вадзіцеляў. Сёлета выявілі болей за 5,5 тысячы фактаў кіравання транспартнымі сродкамі ў стане ап'янення. 117 ДТЗ учынілі нецвярозыя вадзіцелі. Але і пешаходы не саступаюць: у цёмны час сутак з праезнай часткі вывелі і вынеслі 17 тысяч п'яных пешаходаў.

***— Што ж рабіць? Адвечнае пытанне.***

— Выпадае змагацца супраць алкагалізму, за здаровы лад жыцця. Захаванне здаровай нацыі цяпер надзвычай актуальнае пытанне. Калі цяперашнія тэмпы скарачэння насельніцтва Беларусі захаваюцца — а гэта прыкладна мінус 50 тысяч штогод, то нас вельмі хутка стане значна меней.

***— Шчыра сказаць, яшчэ больш мяне пужаюць вялізныя лічбы па рэалізацыі віна-гарэлачных вырабаў.***

— У нас штомесяц рэалізуецца 5 бутэлек гарэлкі на кожнага жыхара, уключна дзяцей і старых. Самая вялікае зло — гэта бытавы алкагалізм. Ад яго ніхто не застрахаваны: ні бомж, ні прафесар. І паважаны ў грамадстве чалавек можа з лёгкасцю прайсці шлях ад чаркі каньяку за вячэрай да таннай бутэлькі «Вясёлай каруселі».

Дарэчы, у жніўні быў дзень цвярозасці, які не ўсе зразумелі. А мы зрабілі аналіз: у гэты дзень у Магілёўскай вобласці ў 5 разоў меней паступіла паведамленняў пра сямейна-бытавыя скандалы.

***— Тады наша мэта зразумелая: гэта сухі закон.***

— На жаль, ні ў адной краіне ён сябе не апраўдаў.

***— Затое даў штуршок для творчасці: рэстарацыя пад выглядам пахавальнага бюро і віскі ў кафейныя кубкі...***

— У рэальнасці ўсё не так рамантычна. Але калі людзі будуць такімі тэмпамі співацца, то трэба будзе пераймаць вопыт і ўводзіць абмежаванні. У Беларусі ёсць дзяржаўная праграма па супрацьдзеянні п'янству і алкагалізму: там задзейнічаны не толькі праваахоўнікі, але медыкі, педагогі, работнікі культуры. Аднак імгненнага выніку не будзе, пра пералом у свядомасці яшчэ рана казаць.

***— Надыходзяць святы, і народу аб'ектыўна ёсць за што выпіць. Як у такіх варунках будзе паводзіць сябе міліцыя?***

— Асаблівыя меры, жорсткія ці, наадварот, лаяльныя, уводзіцца не будуць. Мы ўлічым, што Новы год і Каляды — светлыя і радасныя святы для ўсіх. Таму ўвага нарадаў міліцыі надаецца культурнаму і ветліваму стаўленню да людзей. Тых, хто перабраў і страціў здольнасць самастойна рухацца, будзем дастаўляць у медвыцвярэзнік альбо ў бальніцы. Мы не будзем заломваць рукі за раскаркаванае шампанскае каля ёлкі, але будзем трымаць сітуацыю пад ненавязлівым кантролем.

***— І напрыканцы ваша навагоднее пажаданне.***

— Я не пажадаю не піць на святы — гэта бессэнсоўна. Піце, але ў меру. Каб піццё было ў весялосць і пасля не надышло горкае пахмелле.

**Гутарыла Ілона ІВАНОВА.**

Натура

# ЗАКОН, ЯКІ ЛЬВЫ НЕ ПАРУШАЮЦЬ

**Пра фізічны гвалт у сям'і на гэты раз мы гаварыць не будзем, бо такое здарэнне нікога ўжо не здзіўляе. Вось нейкі тыдзень таму ў пасёлку Гарадзішча пад Баранавічамі жанчына, якая знаходзіцца ў дэкрэтным водпуску, двойчы ўдарыла свайго сужыцеля нажом — банальная з'ява. Падобная інфармацыя найбольш пашыраная ў міліцэйскіх аператыўных зводках. Адкінем п'янства і звязаны з ім (найчасцей) сямейны крымінал, а паглядзім, што, найперш, разбурае сямейную стабільнасць, стварае псіхалагічнае напружанне.**

Аднойчы давялося паглядзець дакументальны фільм з серыі «Жыццё саваны». Англійскія кіношнікі паказалі тэлегледачам фільм пра жыццё львоў. Самыя эфектныя эпізоды той стужкі — гэта эпізоды палявання, але маю ўвагу прыцягнуў іншы.

Наступае час і маладыя львы пакідаюць свой прайд — самцы і самкі разыходзяцца па саване і ствараюць новыя сем'і. Праз год адна львіца вырашыла вярнуцца назад у родны прайд. Здавалася б, там маці, браты і сёстры, але львіцу былая радня сустрэла варожа і не падпускала блізка. Прайд адпачывае і львіца, таксама, ляжыць, але метраў за пяцьдзясят ад былой сям'і. Тая рушыла да вадапою, а следам ільвіца, але зноў жа — на адлегласці.

Прыродай закладзены закон, які рэдка дае збой у жывёльным свеце. Вырас — пакінь роднае логава і ствары сваю сям'ю ці дай нашчадкаў. Рой пакінуў вулей — назад вяртання не будзе.

У людзей тое ж самае, бо на Зямлі ўсё створана па адзіным сцэнарыі. І няхай чалавек «падабенства Божае» ці «вянец Прыроды» са сваёй мараллю, але ён не вызвалены і не выключаны з агульнапрыроднага працэсу. І часта сямейныя праблемы ўзнікаюць з-за таго, што мы ўжо даўно жывём па сваіх законах. Але за лепшае будзе паглядзець тыя праблемы на канкрэтных прыкладах, якіх вялікае мноства ў нашым жыцці.

Вось што адбылося ў адной знаёмай сям'і.

Муж запіў і з'ехаў да састарэлых бацькоў, якія прынялі яго і стварылі для сябе вялікую праблему, але гэта ўжо банальны выпадак. Жонка ж развялася, а бачачы, што жанчына спраўная і яшчэ не ў гадах, то на яе паклаў вока мясцовы аграном і неўзабаве ажаніўся з ёй. Жанчына хату пакінула малодшаму сыну, які са сваёй сям'ёй перайшоў туды жыць, а сама перабралася да мужа. Усе ўладкаваныя і шчаслівыя. Але нядоўгім было тое шчасце, бо да маці вярнулася дачка з двума няпоўнагадовымі дзецьмі.

Маці дачку прыняла, замест таго каб сказаць: «Дачушка, ты пасварылася з мужам, але ж там у цябе катэдж, работа, у цябе дзеці і закон на тваім баку — ужо там твая аснова. А ты кінула ўсё і з'явілася».

Маладзіцу можна зразумець: яна знайшла самае простае выйсце — села маці на шыю, але каб толькі маці. Аграном, чалавек ужо сталага веку, калі ажаніўся, то не думаў, што з жонкай у яго хаце з'явіцца такі пасаг.

Кожная сям'я жыве па сваіх няпісаных законах і ў ёй з часам ствараецца адпаведная атмасфера: быт, звычкі, адносіны...

Уварванне, а інакш не скажаш, у сям'ю іншага чалавека ўсё гэта разбурае і ўжо неабходна наладжваць кантакты наноў, падстройвацца...

Тут ёсць яшчэ адзін істотны момант. Маладзіца думала, што са сваімі дзецьмі вяртаецца да мамы, якая яе гадавала і выдала замуж. Але змянілася не толькі маці, і ў яе самой ужо растуць дзеці — яна вярнулася ў чужую сям'ю, дзе ўсталяваўся іншы парадак, з'явіліся свае інтарэсы.

Вось па гэтай прычыне прайд і не прыняў ільвіцу — яна магла ўнесці ў былую сям'ю сумятню, магло здарыцца і кровазмяшэнне.

Дарэчы, калі жанчына мае дарослую дачку і выходзіць замуж і дачка працягвае жыць у сям'і, то гэты фактар сям'ю не ўмацоўвае. Бывае, што айчым удзяляе падчарыцы празмерную ўвагу. А як тут быць з мараллю — мы ж людзі?!. Мараль мараллю, а ад прыроды не ўцячэш — у маладых тут заўсёды перавага.

Прыкладаў, калі чалавек з жалю да свайго дзіцяці ідзе на крок, аб якім потым будзе шкадаваць усё жыццё, — мноства.

А вось яшчэ адзін прыклад. Да маці вярнуўся сын, бо быццам бы жонка ў яго аказалася няўдалай, хоць пражыў з ёю не адзін год: дзіця займелі і кватэру. Мінула колькі часу, а сын прыводзіць у кватэру маці новую жонку з дзіцем і нічога старая не магла зрабіць, бо сына не толькі пусціла жыць, але і прапісала. З'явілася новая гаспадыня, а з ёю і скандалы, бо на той жа кухні дзвюх гаспадынь не можа быць. І ходзіць жанчына па суседзях ды бядуе: «А чаго гэта на сваю галаву яго прыняла, няхай бы жыў у сваёй кватэры».

Сям'я — гэта прытулак для чалавека, дзе ён можа знайсці спакой, і калі дзеці пакідаюць бацькоў і ствараюць свае сем'і, то абавязаны змагацца за іх, а не навешваць свае праблемы на бацькоў. А тое, што дзецям трэба дапамагчы, падтрымаць іх, то ніхто гэтага не аспрэчвае.

У заходнім грамадстве праблема не такая актуальная. Магчыма, людзі там больш прагматычныя і самастойныя, а мы дужа жаласлівыя, хоць, мяркуючы па колькасці кінутых у нас дзяцей, так думаць няма падставы.

Не выключана, што ў некага ёсць і станоўчыя прыклады. Маўляў, вось нягледзячы на ўсе пертурбацыі ў сям'і парадак. Бывае і так, бо многае залежыць ад канкрэтнага чалавека.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

Крымінал, здарэнні

### СМЕРЦЬ ПАД «ЖЫГУЛЯМІ»

У двары дома па вул. Зенітнай, што ў Баранавічах, 47-гадовы мужчына рамантаваў аўтамашыну ВАЗ-2106. Дамкрат, які прыўзнімаў аўтамабіль, не вытрымаў і чалавек загінуў пад машынай.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

### ВОСЬ ТАКІ ПРЫЁМНЫ СЫНОК...

Сям'я з Гомеля шмат гадоў таму прыняла да сябе хлопчыка. Якія там былі парадкі, як прыёмныя бацькі выхоўвалі падлетка, можна толькі здагадвацца. Песцілі, любілі або зняважалі — не ведаем. Але ж хлопец, стаўшы мужчынам, на рабоце доўга не затрымліваўся, бо лічыў, што ад яе нават коні дохнуць. А вось украсці, пахуліганіць — калі ласка. Таму неаднаразова яго судзілі. Апошні раз — сёлета. І вось гэтымі днямі, патрабаваўшы ў бацькі грошы, які той адмовіўся даць, дзяцюк нанёс яму нажавыя раненні. Бацька апынуўся ў бальніцы, а сын адправіўся на гульбішча з 25 тысячамі рублёў. Яго арыштавалі.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

### Як можна было столькі ўкрасці?

Насамрэч — як? Калі, напрыклад, аб'ект ахоўваецца, як гэта мела месца ў Мазыры. Там са складу адной прамзоны знікла 896 метраў кабелю, 394 — дроту, 790 разетак, 350 выключальнікаў, лесвіцы, драбіны, алмазныя кругі, муфты, курткі, рукавіцы... Такое ўражанне, што на складзе гуляе вецер, бо з яго ў невядомым напрамку знікла таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў на... 48 365 тысяч рублёў. На месцы крадзяжу засталіся сляды зладзеяў і аўтатранспарту.

Паступіла заява ў міліцыю і ад кіраўніцтва Мазырскага домабудаўнічага камбіната, дзе таксама ёсць вартаўнік. З цэха, нібы птушкі ў вырай, вылецеў электраінструмент на суму 7 900 тысяч рублёў.

Будаўнічы «бум» назіраецца і ў Веткаўскім і Жыткавіцкім раёнах. У тым сэнсе, што з будаўнічага аб'екта ў першым выпадку зніклі металічныя канструкцыі будаўнічых рыштаванняў і цэгла, а ў другім — бетонная пліта, якую, вядома ж, на плячах не панясеш.

### На легкавушкі — з сякерай і шылам

У адну і тую ж раніцу каля дзясятка аўтаўладальнікаў з горада Хойнікі подбегам з'явіліся ў міліцыю: знайдзіце зламысніка. Ён (а можа, яны) напалі на легкавушкі, што стаялі на вуліцы ноччу і зрабіў (зрабілі) вялікую шкоду. Нельга нікуды ехаць на машынах, бо ў іх прабіта 36 (!) колаў. Праваахоўнікі аператыўна ўключыліся ў работу і хутка выявілі хулігана. Ім аказаўся 23-гадовы работнік раённага спажывецкага таварыства, які ўжо сядзеў раней на лаве падсудных.

Свае хуліганскія выхадкі паказаў і вучань адной са школ Любанскага раёна, які ў Жыткавічах ноччу сякерай пашкодзіў легкавушку, што стаяла каля чыгуначнага вакзала.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

# Якасць прадстаўленай на конкурс «ГУСТ» малочнай прадукцыі ў гэтым годзе прыкметна павысілася

**Аб гэтым паведаміла карэспандэнту БЕЛТА арганізатар конкурсу Ларыса Карашкова.**

«У гэтым годзе якасць прадстаўленай на конкурс малочнай прадукцыі прыкметна павысілася, значна пашырыўся асартымент, таму конкурс «ГУСТ» цалкам апраўдвае сваё прызначэнне — стварае Гарантыю Поспеху Сучасных Тавараў», — падкрэсліла Ларыса Карашкова.

Журы ацэньвала прадукцыю па сямі традыцыйных намінацыях. Упершыню былі прадстаўлены плаўленыя сыры. А ў будучым годзе будуць выдзелены ў намінацыі і іншыя малочныя прадукты — дзіцячае харчаванне на малочнай аснове, дэсерты, ёгурты і г.д.

Лепшым прызнана пастэрызаванае малако «ЛюбіМае» вытворчасці гарадскога малочнага завода № 1 з горада Мінска. Гэта ж прадпрыемства стала пераможцам у намінацыях «Сыркі тварожныя» і «Сыркі глазураваныя».

У намінацыі «Лепшы мяккі сыр» дыплом пераможцы прысуджаны сыру «Праметэй» вытворчасці ПУП «Рэчыца-малако». У намінацыі «Марожанае» два пераможцы — Лепельскі малочна-кансервавы камбінат («Пламбір малочны») і ЗААТ «Маразпрадукт» (пламбір класічны «20 капеек» і «28 капеек»). Журы высока ацаніла якасць прадукцыі, адзначыўшы, што вытворцы выкарыстоўваюць у вытворчасці марожанага толькі натуральныя інградыенты.

Паводле ацэнкі журы, лепшае сметанковае масла ў Лідскага малочна-кансервавага камбіната, Навагрудскага маславаробнага камбіната і Скідзельскага маслазавода, які ўваходзіць у ААТ «Малочны свет» (г. Гродна). У намінацыі «Сыркі плаўленыя» перамогу атрымалі Полацкі малочны камбінат і Скідзельскі маслазавод.

У намінацыі «Сыркі глазураваныя» разам з гарадскім малочным заводам № 1 горада Мінска перамогу атрымаў Полацкі малочны камбінат.



У сталічным выставачным комплексе «Мінскэкспа» адкрылася штогадовая снежаньская спецыялізаваная і па ліку 17-я выстава «Белагро». Сёлетняя тэматыка выставы: прадукты харчавання, абсталяванне і машыны для харчовай перапрацоўкі, супермаркет, рэстаран, бар, гасцініца. Маркетолаг сталічнага гармалзавода №1 Юлія Царова (на фотаздымку) прэзентуе лепшую прадукцыю свайго прадпрыемства для ўдзелу ў выставачным конкурсе-дэгустацыі «ГУСТ» на лепшы прадукт 2008 года.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Рэпарцёр атрымаў заданне

# УЗЯЦЬ КРЭДЫТ НА...

### Спажывецкія патрэбы

Напрыклад, каб разлічыцца з майстрам, якому мы замовілі міжпакаёвыя дзверы з масіву алешыны. Два гады таму мы спынілі рамонт у сваёй чатырохпакаёвай кватэры, на які бралі крэдыт «Беларусбанку» — 6 тысяч долараў пад 12 працэнтаў гадавых на пяць гадоў. Той крэдыт мы пагасілі датэрмінова, праз паўтара года — з дапамогай маіх бацькоў-фермераў, якія нешта атрымалі з продажу ўраджаю насення пшаніцы. Мы зрабілі амаль усё: выраўнялі сцены, паклеілі прыгожыя шпалеры, замянілі сантэхніку і нават часткова абнавілі мэблю. Але засталіся дзверы, шафы і прыхожая. Пры чым дзверы мы хочам замовіць таму самаму майстру, які зрабіў нам партал у гасцёўню, каб яны не адрозніваліся па колеры і стылі ад таго, што ёсць. А гэта значыць, што разлічвацца нам трэба будзе наяўнымі грашыма, да таго ж, майстар пажадаў, каб доларамі.

Пра мэты ў «Беларусбанку» спыталі адразу і адразу паведамілі, што крэдыт на спажывецкія патрэбы сёння магчыма ўзяць толькі тэрмінам на год, са стаўкай 18 працэнтаў гадавых, і толькі ў беларускіх рублях. Сума крэдыту залежыць ад даходу крэдытаатрымальніка. Таму першае, што трэба зрабіць для яго афармлення, — прынесці з месца працы даведку аб сярэднямесячным заробку за апошнія тры месяцы. Такія ж даведкі — ад двух паручыцеляў. Акрамя таго, пры выдачы крэдыту будуць улічаны нашы выдаткі. Да прыкладу, мой сярэдні заробак роўны 1 мільёну беларускіх рублёў, ад яго аднімаецца плата за камунальныя паслугі — 130 тысяч, яшчэ прыкладна 70 тысяч — выдаткі на электраэнергію, тэлефон і інтэрнэт, улічваецца таксама, што кожны месяц я выплачваю па льготным жыллёвым крэдыце 70 тысяч беларускіх рублёў і з'яўляюся паручыцелем па крэдыце ў свайго калегі па працы. Адным словам, улічваюцца ўсе мае даходы і выдаткі, а таксама крэдытная гісторыя. Дакладную суму крэдыту мне змогуць сказаць толькі пасля разгляду ўсіх маіх дакументаў, але прыкладную назвалі ўжо зараз — 3 мільёны 400 тысяч беларускіх рублёў. Мае дакументы разглядаюцца на працягу 3 працоўных дзён. Трэба яшчэ мець на ўвазе, што за кожны дагавор паручыцельства мне трэба будзе заплаціць 28 тысяч беларускіх рублёў, яшчэ 4 тысячы — за пластыкавую картку, і пры зняцці наяўных грошай банк возьме камісію — 2,5 працэнта. Пры безнаяўным разліку альбо пры разліку па кошт-фактуры плата за картку і 2,5 працэнта выключаецца.

Прызнацца, гэтыя ўмовы мяне не вельмі задаволілі. Гэтых грошай мне не хопіць, каб разлічыцца з майстрам, да таго ж, па маіх разліках, у першыя месяцы я буду выплачваць каля 330 тысяч беларускіх рублёў для пагашэння крэдыту (па меры змяншэння асноўнага доўгу сума будзе змяншацца), ды і на канвертацыі згублю пэўную суму. Аднак гэта лепш, чым нічога. Нам з мужам засталося вызначыцца, што лепей: працягваць жыць без дзвярэй, альбо зноў улазіць у крэдыт. Старэйшы сын, які кладзецца цяпер спаць пасля гадзіны ночы, прапанаваў нам паставіць дзверы толькі ў наш пакой. Можа, і сапраўды?

### На пакупку аўтамабіля

Калі шчыра, пра аўтамабіль марыць у маёй сям'і толькі менш практычныя за мяне мужчыны. Яны амаль сур'ёзна абмяркоўваюць «Фіат-Уліс», «Крайслер-Вояджэр», «Опель-Зафіру», на якіх зручна было б ездзіць у вёску, ну і «Альфа-Рамэа-159» — для душы. Я слухаю іх краем вуха і думаю, як перажыць навалу зімніх святаў і дзён нараджэнняў з меншымі стратамі. Але сёння, як кажуць, дзеля «спартыўнага» інтарэсу, зайшла ў офіс афіцыйнага дылера «Volkswagen AG» «Атлант-М Сухарава» і спытала, ці магчыма ў іх купіць аўтамабіль у крэдыт.

Што самае цікавае, у мяне адразу папыталіся, камерцыйны аўтамабіль я жадаю купіць, альбо легкавы. Акрыяўшы ад такога сур'ёзнага да мяне стаўлення, я адказала, што жадаю купіць легкавы аўтамабіль. Тады менеджар-кансультант папрасіла мяне акрэсліць цанавую катэгорыю. «Сямнаццаць тысяч долараў», — ляпнула я наўздагад. Калісьці я чула пра такія цэны на новыя аўтамабілі.

— Гэта будзе «Гольф» альбо «Джэта», — кіўнула кансультант. — Праўда пакуль такіх аўтамабіляў няма, і наўрад ці «Гольфы» ўжо будуць. «Джэту» можна будзе замовіць за 19,5 тысяч долараў.

Замовіць — гэта значыць, унесці сама мала 10 працэнтаў ад кошту аўтамабіля і падпісаць дагавор куплі-продажу. Але пачаць лепей за ўсё з дакументаў для банка, каб упэўніцца ў магчымасці крэдыт атрымаць. Сума яго таксама будзе залежаць ад маёй плацёжаздольнасці, а працэнтная стаўка — ад таго, у якой валюце я бяру крэдыт і ад таго, ці ёсць у мяне даведка аб заробку. У беларускіх рублях можна ўзяць крэдыт пад 21 працэнт гадавых на сем гадоў. У доларах — пад 15,5 (пры наяўнасці даведкі аб заробку) і пад 17,5 працэнтаў (пры адсутнасці такой даведкі). Праўда, як банк будзе меркаваць пра маю плацёжаздольнасць без даведкі аб заробку, я не зусім зразумела. Можа, па знешнім выглядзе?

Ну і нарэшце я пацікавілася, які сярэдні заробак за апошнія тры месяцы я павінна мець, каб купіць у крэдыт новы «Гольф» за 17 600 долараў. Мне адказалі — мінімум 1 300 тысяч рублёў. Пры названых вышэй умовах ён выйдзе для мяне прыкладна на 5 тысяч долараў, даражэйшым за першапачатковы кошт.

Наконт патрыманых аўтамабіляў мне ўдалося даведацца наступнае. Крэдыт можна ўзяць у доларах на 4 гады на любы аўтамабіль, незалежна ад года выпуску, з правам датэрміновага пагашэння. Паколькі залогам пры гэтым з'яўляецца сам аўтамабіль, то яго страхаванне па сістэме «АўтаКаска» — неабходная ўмова. Мінімальны першапачатковы ўзнос — 20 працэнтаў ад кошту аўтамабіля. Працэнтная стаўка — 18, 21 і 23 працэнты гадавых у залежнасці ад года выпуску аўтамабіля, банка, які бярэцца крэдытаваць і плацежаздольнасці крэдытаатрымальніка. Напрыклад, каб атрымаць крэдыт пад самы маленькі працэнт, неабходна мець высокі афіцыйны даход, і купляць аўтамабіль, які быў выпушчаны не раней за 2000 год. Пры гэтым дакументы будуць разглядацца і крэдыт выдавацца — на працягу 15 дзён. Затое пад самы высокі працэнт можна ўзяць крэдыт без даведкі аб даходах, без паручыцеляў, пасля 20-хвіліннай размовы з супрацоўнікамі банка і на наступны дзень ужо выехаць ад прадаўца на новым аўто.

Калі ўзяць на гэтых умовах крэдыт на 12 тысяч долараў ЗША, то першы месяц давядзецца заплаціць каля 1 200 тысяч, наступныя месяцы працэнт будзе змяншацца за кошт змяншэння асноўнага доўгу, гэта значыць плацеж па крэдыце будзе рабіцца лягчэйшым, але вельмі павольна.



### На набыццё кватэры

У агенцтве па нерухомасці мне адразу сказалі, што сёння ўзяць такі крэдыт вельмі складана. Калі патрэбная сума параўнальна невялікая — тысяч пяць долараў, то гэта яшчэ магчыма, а калі 30-40 тысяч долараў — практычна нерэальна.

— Апошнім часам некаторымі банкамі яшчэ даваліся крэдыты на 20-25 тысяч долараў, але гэта па ранейшым пагадненні, — патлумачыла рыэлтар. — Ёсць надзея, што на пачатку года будуць прынятыя новыя праграмы крэдытавання і ўзяць крэдыт на набыццё жылля стане лягчэй. Працэнтная стаўка зараз — 19-20 працэнтаў гадавых. Але лепей вам патэлефанаваць у банкі.

Далейшую інфармацыю я высвятляла ў банку.

«Прыорбанк» дае крэдыты на набыццё жылля пад залог гэтага самага жылля альбо на ўмовах паручыцельства. У залежнасці ад гэтага адрозніваюцца ўмовы крэдытавання. Крэдыт можна ўзяць толькі ў доларах ЗША, у суме да 35 тысяч (яна не павінна перавышаць 80 працэнтаў ад кошту жылля) пад 17 працэнтаў гадавых.

Тэрмін, на які бярэцца крэдыт, і яго велічыня залежаць ад ўзросту крэдытаатрымальніка, яго заробку і абавязацельстваў. Улічваюцца таксама даходы і абавязацельствы членаў сям'і. Напрыклад, калі сям'я складаецца з трох чалавек: мужа, жонкі ва ўзросце 32 гадоў і няпоўнагадовага дзіцяці, калі заробак кожнага з дарослых роўны 1,5 мільёнам рублёў і яны не маюць больш ніякіх крэдытаў, тады, пры ўмове залогу пад паручыцельства, яны могуць разлічваць на крэдыт у памеры 24 тысяч долараў на 5 гадоў (самая вялікая выплата па крэдыце пры гэтым — 695 долараў у першы месяц, потым паступова выплата змяншаецца), альбо ў памеры 30 тысяч долараў — на 10-15 гадоў (максімальная выплата ў першы месяц — 612 долараў).

Калі крэдыт выдаецца пад залог нерухомасці, выплата па крэдыце будзе аднолькавай кожны месяц — 628 долараў, калі крэдыт склаў 35 тысяч долараў ЗША на 10 гадоў; і 559 долараў, калі тая ж сума выдаецца на 15 гадоў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# АЎТО ПА КІШЭНІ НЕ ЎСІМ

**Сусветны фінансавы крызіс — крызісам, а мяркуючы па колькасці аўтамабіляў на вуліцах беларускіх гарадоў і чэргах на рэгістрацыю ў ДАІ, у Сінявокай па інэрцыі працягваецца спажывецкі бум. Не выключна, што нашы суайчыннікі ў набыцці аўто бачаць магчымасць захаваць назапашаныя з такой цяжкасцю грошы ад усемагчымых інфляцый і дэвальвацый. З рублём мы гэта ўжо праходзілі, еўра, які літаральна за некалькі месяцаў абваліўся ледзь не на 20 працэнтаў, таксама не апраўдаў спадзяванняў, а «зялёны» хоць зараз і набірае ў вазе, цалкам можа зрабіць даволі непрыемны сюрпрыз ужо ў сярэдзіне наступнага года. Праўда, застаюцца яшчэ больш стабільныя ўкладанні ў нерухомасць, але ж за 5-10 тысяч «умоўных», акрамя гаража, сёння ўжо нічога і не купіш. А вось аўтамабіль...**

Дарэчы, спецыялісты адзначаюць, што беларусы сталі больш набываць новых аўто. Ды і даражэйшага, а значыць больш свежага і надзейнага «сэканда» на дарогах становіцца ўсё болей. Вось такі «наш адказ» сусветнай стагнацыі.

Што ж, наступны матэрыял будзе цікавы менавіта тым, хто, нягледзячы на ўсе несуцяшальныя прагнозы эканамістаў, вырашыў далучыцца да арміі аўтамабілістаў ці памяняць «жалезнага каня». Улічваючы прыведзеную вышэй тэндэнцыю, пачнём з аўтасалонаў.

Лепшы аўто — новы аўто, сцвярджаў старына Генры Форд і меў рацыю. Не можаце сабе дазволіць аўто вашай мары? Не бяда — адчуўшы патэнцыйнага пакупніка і магчымасць пагрэць на вас рукі, на дапамогу прыйдуць банкі.

Аўтакрэдытаванне сёння з'ява даволі распаўсюджаная. На жаль, пра 9-12 працэнтаў гадавых у валюце, якія яшчэ некалькі месяцаў таму прапаноўвалі афіцыйныя дылеры сусветнавядомых брэндаў (акрамя некаторых акцый. **Аўт.**) давядзецца забыцца. Ды і далёка не ўсе фінансавыя ўстановы зараз гатовыя па-ранейшаму аказаць такую паслугу. Спісы партнёраў аўтадылераў значна скараціліся, і насупраць канкрэтнай назвы банка часта значыцца «часова не выдае». Сітуацыя пастаянна мяняецца.

Дык на якую суму крэдыту і працэнтную стаўку па ім можна разлічваць сёння? Тут кожны банк вырашае сам у кожным канкрэтным выпадку. Агульная прыкладная схема, якой вы самастойна зможаце скарыстацца да паходу ў банк, усё ж існуе. Максімальны крэдыт, на які вы зможаце прэтэндаваць, разлічваецца наступным чынам. Сумуецца сукупны прыбытак сям'і (возьмем пару, у якой абодва маюць працу): напрыклад, 400 у.а. памножым на два (дзве зарплаты) і памножым на 12 месяцаў. Атрымліваецца 9600 у.а. Ад гэтай сумы трэба адняць пражытковы мінімум на кожнага члена сям'і (возьмем трох чалавек): прыкладна 100 у.а. на кожнага чалавека множым на тры і на 12 (месяцаў). Атрыманую суму аднымаем ад гадавога прыбытку: 9600-3600=6000. Цяпер 6000 у.а. множым на колькасць крэдытных гадоў (звычайна да пяці). Вось тэарэтычны максімум. На практыцы ж пражыць на 100 у.а. месяц вам наўрад ці ўдасца. Гэта разумеюць і банкі. Таму і сумы крэдыту выдаюць значна больш сціплыя.

Напрыклад, скарыстаўшыся крэдытным калькулятарам ААТ «Беларусбанк» пры ўмове чыстага прыбытку за месяц у памеры аднаго мільёна рублёў я атрымаў максімальную суму крэдыту ў 13 532 110 рублёў.

Цяпер да працэнтных ставак па крэдытах. У тым жа «Беларусбанку» на набыццё аўто «ва ўзросце» да 10 гадоў яна складае 24 працэнты (у беларускіх рублях). Балюча, але значна танней знайсці наўрад ці ўдасца. Прапаноўваюць банкі і валютныя крэдыты — ад 16 да 19 працэнтаў гадавых. Працэнтная стаўка ў межах 1-2 працэнтаў залежыць ад таго, падаяце вы даведку аб даходах ці не. Для некаторых банкаў такая даведка з'яўляецца абавязковай.

У некаторых выпадках працэнтная стаўка залежыць і ад таго, які працэнт ад кошту аўтамабіля вы гатовы ўнесці самастойна. Патрабаванні банкаў звычайна складаюць ад 10 да 30 працэнтаў кошту аўто.

Не варта забывацца і на тое, што хоць працэнтная стаўка па крэдыту і з'яўляецца вельмі важным паказчыкам, на канчатковую суму выплат істотна ўплывае не толькі яна. У дагаворы варта звярнуць увагу на такі пункт, як разлікова-касавыя плацяжы. Як правіла, салідныя банкі не стануць нахабна падманваць кліентаў, але лепш быць пільным. Адсюль і наступны пастулат: не варта звязвацца з сумнеўнымі канторамі, няхай сабе яны і абяцаюць меншую працэнтную стаўку — сабе даражэй выйдзе.

Яшчэ адзін артыкул выдаткаў — страхаванне. Калі банк пазычае вам грошы, ён хоча быць перакананым у тым, што яны вярнуцца. Закладам, як правіла, выступае сам аўтамабіль, які набываюць. Таму лагічна, што вас абавяжуць застрахаваць яго па поўнай. АўтаКаска сёння складае прыкладна 5 працэнтаў ад кошту самога аўто ў год. Даволі адчувальна.

### Колькі плаціць штомесяц?

У выпадку, калі мы возьмем тыя ж 13 532 110 рублёў на пяць гадоў у «Беларусбанку», то штомесяц давядзецца плаціць прыкладна па 500 000: 229 360 асноўнага доўгу і 270 640 рублёў па працэнтах.

Калі цікавасць не знікла, пераходзім да наступнага кроку.

### Хто можа прэтэндаваць на крэдыт?

Як правіла, крэдытаатрымальнікамі, як і паручыцелямі, могуць выступаць дзеяздольныя фізічныя асобы — грамадзяне РБ ці асобы, якія маюць від на жыхарства ў РБ, якія адпавядаюць наступным патрабаванням:

❑ пражыванне і наяўнасць рэгістрацыі (прапіскі) у РБ;

❑ узрост ад 20 да 60 гдоў;

❑ ажыццяўленне працоўнай дзейнасці і атрыманне прыбыткаў на тэрыторыі РБ;

❑ працоўны стаж не меншы за год.

З дакументаў, неабходных для разгляду заяўкі на атрыманне крэдыту, спатрэбяцца заява-анкета атрымальніка крэдыту (паручыцеля), копіі пашпартоў, копіі іншага дакумента, які пацвярджае асобу атрымальніка крэдыту (вадзіцельскае пасведчанне), а для асоб прызыўнога ўзросту — ваенны білет, пры неабходнасці даведка аб даходах за 3-6 месяцаў з месца працы, дагавор куплі-продажу (у розных банках патрабаванні могуць адрознівацца — **Аўт.**).

Чакаць адказу ад банка давядзецца мінімум 3-5 дзён. Ад сябе адзначым, што нават адпаведнасць усім прыведзеным вышэй патрабаванням не гарантуе вам атрымання такога чаканага крэдыту.

**Сяргей АЛЯКСАНДРАЎ.**

Спажывец

# «Пракруцілі»

**Камітэт дзяржаўнага кантролю Беларусі выявіў прыватныя фірмы, якія займаліся незаконным продажам імпартнага піва. Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе КДК.**

У час кантролю за абаротам імпарту піва прааналізавана дакументацыя 65 суб'ектаў прадпрымальніцкай дзейнасці, якія займаюцца ўвозам і рэалізацыяй піва замежнай вытворчасці. Дакументальная праверка паказала, што за студзень—чэрвень гэтага года 4,15 млн літраў імпартнага піва на суму Br 8,3 млрд было рэалізавана самімі імпарцёрамі або праз пасрэдніцкія структуры арганізацыям, якія не робяць справаздач падатковым органам. Асобныя такія арганізацыі ўжо ліквідаваныя, а некаторыя — адмаўляюць факты атрымання піва.

У ліку правераных суб'ектаў гаспадарання — прыватнае гандлёвае ўнітарнае прадпрыемства «ББТ», заснавальнікам, кіраўніком і галоўным бухгалтарам якога з'яўляецца 30-гадовы мужчына. Як сцвярджае малады дырэктар, ён, маючы шэсць класаў адукацыі і чатыры судзімасці (за хуліганства, крадзеж, нявыплату аліментаў і спробу выкрасці аўтамабіль), толькі фармальна кіраваў прадпрыемствам: падпісваў дагаворы, накладныя, падатковыя разлікі і іншыя дакументы, якія яму ўручалі рэальныя гаспадары бізнэсу.

Паколькі правяраючым не былі перададзены дакументы фірмы, яе фінансава-гаспадарчая дзейнасць вывучалася праз сустрэчныя праверкі 47 прадпрыемстваў-контрагентаў, што дазволіла выявіць мноства парушэнняў заканадаўства.

Так, з лютага па жнівень 2008 года праз фірму «ББТ», па-першае, былі выведзены ў ценявы абарот атрыманыя ад 25 беларускіх партнёраў розныя таварна-матэрыяльныя каштоўнасці на агульную суму Br11,3 млрд, уключна імпартнае піва на суму Br5,6 млрд. Гэта значыць, што тавары былі купленыя ў легальных прадаўцоў, але куды ў далейшым рэалізаваныя — не вядома. Па-другое, фірмай «ББТ» легалізавана «крымінальных» таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў (пажарнае і лабараторнае абсталяванне, будматэрыялы, карнізы, кандэнсатары, рэактывы і г.д.) на агульную суму Br9 млрд. Гэтыя тавары прададзеныя без дакументаў на іх набыццё. У выніку такіх «гаспадарчых» аперацый бюджэт недаатрымаў Br3,5 млрд.

Цяпер рух «пракручаных» праз фірму тавараў, а таксама іх прадаўцы і пакупнікі выяўляюцца кампетэнтнымі органамі, адзначылі ў КДК. У дачыненні да кіраўніка фірмы «ББТ» узбуджана крымінальная справа.

### ВЫТВОРЧАСЦЬ ПІВА Ў БЕЛАРУСІ СКАРАЦІЛАСЯ

**Аб гэтым паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў канцэрне «Белдзяржхарчпрам».**

У кастрычніку выпуск піва скараціўся на 27,6 працэнта ў параўнанні з вераснем. Усяго за 11 месяцаў гэтага года ў краіне выраблена 33,052 млн дал піва, што перавысіла ўзровень аналагічнага перыяду 2007 года на 0,3 працэнта. Гэты нязначны рост адбыўся пераважна за кошт павелічэння на 44,9 працэнта вытворчасці піва на ААТ «Піўзавод Аліварыя» (да 6,012 млн дал). На 7,5 працэнта павялічыла вытворчасць ААТ «Лідскае піва» і на 63,8 працэнта — СТАА «Мінскае піва». Астатнія прадпрыемствы знізілі аб'ёмы вытворчасці. ААТ «Крыніца» зменшыла выпуск піва на 6,2 працэнта да 12,641 млн дал, піваварная кампанія «Сябар» — на 12,9 працэнта да 4,425 млн дал, ААТ «Брэсцкае піва» — на 5,1 працэнта да 2,643 млн дал, СП «Рэчыцапіва» ААТ — на 7,3 працэнта да 2,473 млн дал.

Скарачэнне аб'ёмаў піўнога рынку ў «Белдзяржхарчпраме» тлумачаць ростам імпарту і змяншэннем продажаў айчыннага піва праз кіёскі ў Мінску, колькасць якіх апошнім часам значна зменшылася.

*(Працяг тэмы на 6 стар.)*

*Вниманию акционеров ОАО «Белгорхимпром»*

Внеочередное общее собрание состоится **19 декабря 2008 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17 в актовом зале.

**Повестка дня:**

1. Об увеличении уставного фонда ОАО «Белгорхимпром».
2. О внесении изменения в устав ОАО «Белгорхимпром».

Регистрация акционеров в день проведения собрания с 9.00 до 10.30 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17, в актовом зале (3 этаж).

УНН 600024712

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже обращенного в доход государства административного корпуса со встроенными гаражами (941,7 кв.м), расположенного: г. Мядель, ул. Интернациональная, 17. Начальная цена снижена на 10 % и составляет 141 792 120 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 26.07.2008 г. Аукцион состоится **30.12.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.12.2008 г.** до 17.00 по указанному адресу.

**Контактный телефон (8017) 2246134.**
**Сайт в интернете: www.rlt.by**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015*

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже 6 (шести) газотурбинных двигателей НК-12СТ. Начальная стоимость снижена на 50 % и составляет – 1 351 500 000 бел. руб. с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 23.09.2008 г. Аукцион состоится **30.12.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.12.2008 г.** до 17.00 по указанному адресу.

**Контактный телефон (8017) 2246134**
**Сайт в интернете: www.rlt.by**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.*

Этнаскарбонка

# Наш адказ кітайскім гараскопам

**Мы выдатна вывучылі ўсходні гараскоп. Мы да дробязяў ведаем, як сустракаць кожны Новы год, звязаны з пэўнай жывёлінай: якога колеру адзенне апранаць, якую ежу на стол ставіць і чаго чакаць ад кожнай усходняй істоты. Усходні гараскоп аказаўся вельмі зручнай камерцыйнай прынадай, вытворцам не трэба ламаць галаву, чым бы завабіць пакупніка: напярэдадні святаў людзі размятаюць усялякія сувеніры, звязаныя з сімвалам года. Зараз мы з задавальненнем скупляем ўсялякіх каровак і бычкоў. Але мы нічога не ведаем пра традыцыі ўшанавання гэтай жывёліны на нашай зямлі.**

Пра значэнне каровы для гаспадаркі можна было б гаварыць доўга. Памятаеце казкі, дзе карова нездарма выступае апякункай сіраціны? У сям'і, дзе гадуюцца дзеці, без яе абысціся было цяжка. Карова — адна з найбольш рана прыручаных жывёл. Яе вельмі цанілі. «Што за гаспадар без каровы», — гаварылі раней. Карову называлі «карміцелькай». Яе берагалі ад сурокаў, чыталі над ёй замовы, прытрымліваліся засцерагальных прадпісанняў. Напрыклад, калі разлівалася малако падчас дойкі каровы ў полі, яго абавязкова трэба было затаптаць у зямлю — каб ведзьма не пакаштавала. Удалай каровай нельга было хваліцца, а малако не пажадана было несці ў нічым не прыкрытай даёнцы (каб дрэннае вока не пабачыла).

Словы «карова» і «каравай» паходзяць ад аднаго кораня. Часам на вясельным караваі рабіліся выявы рагоў і вымя, як сімвал дабрабыту і «ўрадлівасці» будучай сям'і. У некаторых беларускіх святочных абрадах бык і цялушка сімвалізуюць жаніха і нявесту. Ва ўкраінскіх народных песнях маладыя называюцца турыцай і турам, а сватанне параўноўваецца з паляваннем на тура. У латышскай міфалогіі ў выглядзе каровы выяўлялася багіня — апякунка дзяўчат і сямейнага шчасця.

Але ў традыцыях нашых продкаў шмат увагі надавалася і быку. «Першыя сляды ўшанавання гэтай жывёліны на Беларусі вядомыя з часоў позняга неаліту. У могільніку культуры шарападобных амфараў каля пасёлка Красносельскі, што на Гродзеншчыне, разам са шкілетамі іншых свойскіх жывёл ляжалі косткі быка», — **расказвае супрацоўнік Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Эдвард ЗАЙКОЎСКІ.** Культ быка быў распаўсюджаны на Беларусі і за яе межамі. Вучоныя сустракалі пахаванні як чалавека з косткамі быка, так і асобна жывёлін. На гарадзішчы мілаградскай культуры Гарошкаў (Гомельская вобласць) знойдзены гліняныя фігуркі буйной рагатай жывёлы. У шэрагу населеных раёнаў (вёска Улазавічы на Іпуці (Браншчына), Гадзілавічы Рагачоўскага, Янушкавічы Лагойскага, Палоскі Дрыбінскага раёнаў, у Полацку, а таксама ў Латвіі) былі знойдзены круглыя металёвыя падвескі з выявай галавы быка. Зробленыя яны былі ў канцы X—XII стагоддзі і характэрныя для тэрыторыі, дзе пражывала славянабалцкае насельніцтва. Эдвард Зайкоўскі спрабаваў разгадаць семантыку выяў на гэтых жаночых упрыгожваннях. Абадок падвесак па перыметру аздоблены выпуклымі кропкамі, колькасць якіх набліжаецца да 52 (што супадае з колькасцю тыдняў у годзе). У сярэдзіне падвескі — выява галавы быка, што, магчыма, сімвалізавала год (яшчэ задоўга да нашай эры ў протаіндыйскай цывілізацыі знойдзены пячаткі, дзе выява быка атаясамлівалася з годам). Вакол галавы размешчаны сем фігурак, якія маглі азначаць сем дзён тыдня.

Яшчэ адзін з варыянтаў расшыфроўкі такога малюнка: фігуркі — гэта сем каравайніц (па старажытных правілах каравай павінна было рабіць менавіта столькі жанчын). Узгадаем, што словы «карова» і «каравай» агульнага паходжання.

Але ў часы паганства ўсе культавыя рэчы былі полісемантычныя. Магчыма, адначасова сем фігурак атаясамліваліся з зоркамі з сузор'я Плеядаў (старажытная славянская назва якога — Валасажары). Сузор'е гэта было звязана з паганскім богам Вялесам, які мог з'яўляцца ў розных іпастасях, у тым ліку і ў выглядзе быка. Адсюль і сувязь «Вялес» і «вол». Вялес апекаваў жывёлагадоўлю, гаспадарчую дзейнасць, быў звязаны з ніжнім светам, холадам, цемрай, вытокамі вод. Сувязь вала з ніжнім полюсам пацвярджаецца беларускімі загадкамі, дзе ён азначае мароз: «Прыйшоў вол, выпіў вады дол». «Мяркую, што Зюзя, які з'явіўся ў больш познім фальклоры, а пазней і Дзед Мароз — гэта адна з іпастасяў Вялеса», — заўважае Эдвард Зайкоўскі.



Божышча быка сустракаецца ў розных народаў. У старажытнаіндыйскім зборніку рэлігійных тэкстаў «Рыгведзе» Урытра (праціўнік грамавержцы Індры), атаясамліваецца з валом (пакладаным быком). Вобраз чалавека-быка з'яўляецца ў палеалітычных малюнках Заходняй Еўропы. Крыцкаму чалавекубыку Мінатаўру прыносілі чалавечыя ахвяры. У старажытнаегіпецкіх «тэкстах пірамідаў» бык нярэдка атаясамліваўся са змеем. Вобраз рагатага змея сустракаецца і ў інданезійцаў, кітайцаў, індзейцаў.

Славянскі Вялес таксама выяўляўся ў выглядзе чалавека-быка. Пазней ў фальклоры гэты вобраз мог дэградаваць. Напрыклад, у сучаснай Літве Вяльняс атаясамліваецца з чортам.

З прыняццем хрысціянства, каб заваяваць народныя масы, паганскія святы і паганскіх багоў сталі замяняць падобнымі па функцыі хрысціянскімі. На думку Эдварда Зайкоўскага, пэўныя рысы былога Вялеса маглі перадацца шэрагу святых — Флору, Юрыю, Мікалаю.

Дарэчы, рагатая жывёліна мела дачыненне і яшчэ да аднаго паганскага бога, супраціўніка Вялеса — Перуна. З этнаграфічных даследаванняў відаць, што быка прыносілі ў ахвяру святому Іллі, які стаў хрысціянскім «заменнікам» Перуна. Прычым паганскаму богу маланак ахвяраваўся тур, а Вялесу — іншыя віды быкоў. Пра сувязь з Перуном сведчаць загадкі пра гром і маланкі: «Тур ходзіць па гарах, а Турыца па далах», «Тур — то свісне, Турыца — то мігне», «Раўнуў вол за сто гор, за сто рэчак», «Чорны вол раве на сто гор». Чорная навальнічная хмара магла асацыявацца з турам, які меў чорную афарбоўку.

У беларускім фальклоры прасочваюцца загадкі пра быка як сімвал надыходу новага дня: «Сівы бык ў акенца шмык» (світанак), «белы бык у акно тык» (дзень), «Прыйшла чорная карова, усіх людзей папарола; прыйшоў белы бык, пад вакно нік, усе людзі паўставалі» (ноч і дзень). У народным дойлідстве сустракаюцца выявы сонца і рагоў быка над брамай.

Сляды ўшанавання быкоў засталіся і ў тапаніміцы. У Беларусі захаваліся населеныя пункты з коранем «тур» — Тураў, Турыйск, Тураўля, Турэц. Каля вёскі Замэчак, што ў Чашніцкім раёне, ёсць Турава гара, у паўночнай Беларусі сустракаюцца назвы тыпу Валова гара. Прынамсі, у ваколіцах Турава яшчэ ў XIX стагоддзі дзяўчаты насілі адмысловы галаўны ўбор з вялікімі турынымі рагамі, які рабіўся з саломы і тканіны. Адзін з традыцыйных беларускіх танцаў — «Бычок», найбольш стары варыянт яго блізкі да карагодаў, у якіх танцоры імітавалі баданне бычкоў. Гэты танец быў адным з элементаў гульні «Жаніцьба Цярэшкі», прымеркаванай да Калядаў, якая была пашыраная на поўначы Беларусі. Прынамсі, на тэрыторыі сучаснай Расіі была таксама зімовая гульня, звязаная з рагатай жывёлінай. У перыяд з 25 снежня па 6 студзеня моладзь «гуляла ў быка». Пераапрануты хлопец трымаў у руках пад пакрывалам вялікі гліняны гаршчок з прымацаванымі да яго сапраўднымі рагамі быка. Ён бадаў дзяўчат так, каб ім было не толькі балюча, але і сорамна. Тыя падымалі крык і заканчвалася ўсё тым, што адзін з хлопцаў біў паленам па гаршчку, каб той разламаўся, і пераможанага быка выносілі.

У шэрагу мясцін Беларусі вядомыя ледавіковыя валуны, пра якія захаваліся паданні, што гэта скамянелыя валы і аратыя, пакараныя за грахоўную працу на Вялікдзень. У Юравічах Чэрвеньскага, Сцебіракі Вілейскага раёнаў і іншых мясцовасцях захаваліся камяні з назвамі Быкі.

І яшчэ ў старажытных традыцыях быка звязвалі з месяцам. Прыгледзьцеся да маладзіка, хіба серп не нагадвае рогі быка?

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

ЗВЯЗДА 11 снежня 2008 г.

Зачапіла!

# У жонкі пад пятой

**Пра жанчын, якім у сям'і прыходзіцца цяжка, якія пакутуюць ад фізічнага і псіхалагічнага ўціску з боку мужчын, гаворана шмат, а вось як распраўляюцца іншым разам са сваімі мужамі жонкі — тэма амаль закрытая. Бо абвінавачваецца мужчына — гэта ён «цямця-лямця», таму і апынуўся ў жонкі пад пятой. І праўда ў гэтым ёсць, але яна не такая ўжо і бясспрэчная.**

Прыведзеныя ніжэй прыклады ўзятыя з жыцця, ды і ў іншым калектыве нешта падобнае можна ўбачыць.

Прыходзіць у лабараторыю адна з супрацоўніц і расказвае: «А ўчора я з суседкай насмяялася. Вярнуўся з работы мой і адразу на кухню — зазірнуў у каструлю, а там на паперцы дуля. Зазірнуў у другую, а там напісана: «А ты прадукты купіў?» і пайшоў у магазін».

Прысутныя жанчыны толькі пераглянуліся, а калі расказчыца выйшла, адна ўздыхнула: «Калі б я такое зрабіла, то мой Віця забіў бы мяне разам з суседкай». А другая дадала: «Можа, кахае ўжо так?»

Не ведаю, як там наконт кахання, бо тая жартаўніца — не прыгажуня, а, хутчэй, «шэрая мыш». І хоць муж у яе — намеснік дырэктара завода і мужчына не горшы знешне за многіх і разумны, але апынуўся ў жонкі пад пятой.

Неабходна адзначыць, што не кожная жанчына, якая ў сям'і верхаводзіць, сцерва, але хапае і такіх. Бывае, што энергія ў жанчыны б'е праз край і часта яна не пазітыўная.

Мужчыны ж, як правіла, трапляюцца рахманыя і не могуць даць адпор. Актыўнасць жонкі псіхалагічна прыгнятае мужа, нясе яму пагрозу і часам заканчваецца трагічна, хоць фізічна гвалту і не было.

Аднойчы на прыпынку ў чаканні электрычкі давялося паназіраць сцэнку з немаладой парай — ён чалавек спакойны і мажны, а яна, дробная і чарнявая, усё мітусіцца і гаворыць, гаворыць... за вочы яе празвалі «скочкай». Неяк яе муж паскардзіўся: «Я так стаміўся, на рабоце цэлы дзень, а цяпер яшчэ едзь на дачу... завяла там козаў, гусей... і хата гніе пры балоце». Чалавеку паспачувалі, а праз месяц сустракаем «скочку» ў чорнай хустачцы. Думалі, што нехта з бацькоў памёр, а аказалася, муж павесіўся. Мінула яшчэ некалькі месяцаў, як даведаліся, што ў жанчыны дачка памерла — пасля смерці бацькі ў маладзіцы здарыўся цяжкі інфаркт.

Здавалася б, такая бяда павінна была надламаць жанчыну, ды не. Праз дзесяць гадоў з таго часу яна ўсё гэтаксама некуды спяшаецца, залазіць з сумкамі ў аўтобус, бяжыць на электрычку...

А каб муж даў адпор, збіў пыл жонкі і няхай гэта не зусім па-інтэлігентнаму, а добра страсянуў яе, то жыў бы і сёння. Жонка сціхла б, а калі не, то трэба сыходзіць.

Бывае, што жонка кіруе «ціхай сапай» і нават не кідаецца ў вочы яе пананаванне ў сям'і. У прынцыпе, гэты варыянт прымальны для мужа і ён нават не губляе пачуцця сваёй значнасці... Такую сям'ю можна нават ставіць у прыклад.

Як правіла, усе мужчыны, якія трапляюць «пад пяту» жонак, здзейсніліся як спецыялісты, часта займаюць нейкія пасады, паважаныя людзі, а ў сямейным жыцці...

Яшчэ адзін прыклад.

Супрацоўнікі аддзела прыкмецілі, што ў іх начальніка ніколі няма ў кішэні і рубля. Калі часам неабходна было скінуцца на нейкае мерапрыемства, то прасіў тую тысячу пазычыць. А потым высветлілася, што ўсе грошы забірае жонка, хоць муж і не аматар выпіўкі.

Аднойчы, пасля чаркі, нехта з аддзела сказаў начальніку, што так нельга, бо ва ўсім ёсць мяжа.

— Ды не хачу я гэтых скандалаў, толькі пачні, то канца ім не будзе, — адказаў той.

Мужчыны ад жаночага псіхалагічнага ўціску пакутуюць, але ў іх не хапае сілы волі, каб паспрабаваць вырвацца з-пад яго і лічаць за лепшае, каб усё заставалася як ёсць, абы было ў доме ціха.

Але ўсе гэтыя размовы — марная трата часу. Тут ёсць адна заканамернасць. Калі сям'я, у якой гаспадарыць жонка, распадаецца, то пры паўторным шлюбе жанчына стараецца быць зноў вядучай, а былы муж у новай сям'і апынецца ў ролі вядомага.

Усё больш складана, чым здаецца на першы погляд, бо процістаянне жанчыны і мужчыны, іх барацьба за першынство мае карані, якія губляюцца ў глыбіні вякоў.

Першабытнае грамадства фарміравалася на жаночай лініі, жанчыны верхаводзілі ў грамадскім і эканамічным (гаспадарчым) жыцці. Мужчыны ў перыяд матрыярхату былі на другім плане.

Але з цягам часу мужчыны ўзялі верх, дарэчы, не з дапамогай розуму, а дзякуючы грубай сіле — толькі гэта не значыць, што патрыярхат усталяваўся назаўсёды.

Жанчыны паступова вяртаюць страчаныя пазіцыі і тое, што ў палове сем'яў (цывілізаванага свету) верхаводзяць яны, нічога дзіўнага няма. Пры роўных умовах развіцця ў грамадстве жанчына можа нават мець перавагу.

А для сям'і і не важна, хто ў ёй гаспадар. Калі мужчына не мае розуму, то радасці ў сям'і мала, тое ж самае можна сказаць і пра жанчыну.

Жыць «пад кулаком» у мужа, ці ў жонкі «пад пятой» — кожны выбірае сам.

А хто верхаводзіць у маёй сям'і, то за сорак гадоў я так і не зразумеў...

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# ПАЛЯЎНІЧЫ БЕЗ СТРЭЛЬБЫ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Дарэчы, беларускіх паляўнічых з лайкамі на гэтых спаборніцтвах было няшмат. Ці таму, што папулярызацыя такога віду спаборніцтваў у нас яшчэ зусім нешырокая, ці дзяржаўныя паляўнічыя гаспадаркі ігнаруюць правядзенне міжнародных спаборніцтваў? А вось замежным гасцям, здаецца, тут зусім нядрэнна. Бо некаторыя прыязджаюць дзесяць і болей разоў. І не толькі таму, што ў Літусаве ўтульны гасцінічны дом, у якім усім хапае месца, цяпла і ўвагі. Не менш важныя для аматараў палявання новыя знаёмствы, абмен вопытам. І, зразумела, сустрэча з прызнаным спецыялістам па развядзенні лаек, непасрэдным удзельнікам спаборніцтваў Аляксандрам Барысёнкам. Палова псоў, якіх звычайна прывозяць сюды для ўдзелу ў спаборніцтвах, выведзены менавіта на барысёнкавым падворку альбо паходзяць ад сабак-продкаў, радаводная якіх пачыналася менавіта ў Літусаве. Чатырохногія выхаванцы Барысёнка нярэдка становяцца пераможцамі буйных расійскіх чэмпіянатаў. А яго маладая лайка па мянушцы Карнач на леташніх спаборніцтвах стала абсалютным чэмпіёнам.

«У Літусаве заўсёды высокі ўзровень спаборніцтваў, за ўвесь час іх правядзення не паступіла ніводнай скаргі», — дзяліўся ўражаннямі эксперт усерасійскай катэгорыі па выпрабаваннях і пародах лаек 73-гадовы масквіч Барыс Ягораў.

Што падштурхнула колішняга спартсмена, майстра спорту міжнароднага класа і нават абсалютнага чэмпіёна свету ў цяжкай атлетыцы Аляксандра Барысёнка стварыць уласную паляўнічую гаспадарку, праводзіць чэмпіянаты і разводзіць лаек? Старонкі сваёй біяграфіі ён прыадчыніў, калі спаборніцтвы ў Літусаве завяршыліся і апошні ўдзельнік пакінуў гасцінны дом, а жыццё фермера ўвайшло ў звычайнае рэчышча.

«Шмат гадоў я з'яўляюся сябрам Смаленскага кіналагічнага клуба «Паляванне», які рэгулярна праводзіць міжнародныя спаборніцтвы. Удзельнічаў ва ўсіх чэмпіянатах, добра ведаў кухню арганізацыйнай працы. Міжволі выспела думка: чаму б у Беларусі таксама не распачаць падобны рух. І я гэтым літаральна загарэўся. На спаборніцтвы ў 1995-м у Беларусь прыехалі толькі дваццаць чалавек, але і гэта быў поспех», — прыгадвае Аляксандр Барысёнак свае першыя крокі ў новым для сябе амплуа.

Мы едзем па арандаваных ім паляўнічых угоддзях. Абапал дарогі яркая зеляніна азімых узыходаў, каб на іх яшчэ да снегу мог выходзіць на кармленне лось ці казуля. Далей сцяною ўзвышаецца кукуруза — сапраўдны ласунак для дзікоў. Аляксандр хоча на канкрэтных прыкладах паказаць, як выглядае яго гаспадарка, што гэта не толькі лес і палеткі, але і надзейна ўзведзеныя паляўнічыя вышкі, з якіх можна назіраць дзікоў і ласёў, кармавыя паляны, каля якіх у халодны час найчасцей трымаюцца лясныя насельнікі. 33 тысячы гектараў, узятыя Барысёнкам у арэнду, аб'ехаць хутка немагчыма ды і няма гэткай патрэбы. Узнімаемся на адну з назіральных вышак. У хатцы на высокіх слупах-апорах ёсць печка, драўляны ложак. У зімовы час паляўнічаму тут даволі камфортна, сядзі сабе ў цяпле, цікуй, чакай сваю здабычу. І ахвотных, заўважае гаспадар, атрымаць ліцэнзію ў паляўнічай гаспадарцы «Барысёнак» нямала.



З лайкамі месячнага ўзросту — прыгажосці гэтых маленькіх жывёл гаспадар ніколі не перастае здзіўляцца.

❑ З вышкі, як і з падыходу, звычайна страляюць дзеля трафея, — тлумачыць паляўнічыя хітрасці Аляксандр. — Але тады гіне лепшы і мацнейшы звер. А вось паляванне з сабакам — натуральны адбор, бо гіне слабейшы. Моцны сябе ў крыўду не дасць.

❑ Аляксандр перакананы, што сапраўдны паляўнічы — той, хто палюе ў лесе менавіта з сабакам. Добрая лайка, а ў паляванні на дзіка іх павінна быць не менш за дзве, пачуе звера здалёк, дагоніць і будзе трымаць яго да падыходу паляўнічага. З дзіком, калі ён у стомленым стане, няцяжка справіцца без стрэльбы — хапае і паляўнічага нажа. Толькі не кожны паляўнічы на гэта адважыцца, куды прасцей ускінуць стрэльбу і націснуць на курок. А кемлівую і працавітую лайку мала атрымаць ад пародных сабак, яе інтэлект трэба яшчэ і развіць. Па словах Барысёнка, у Беларусі на дзесяць паляўнічых толькі адзін сапраўдны сабакагадовец.

«Многія лічаць, што іхнія сабакі працуюць, але яны памыляюцца. Яны ходзяць па лесе з лайкамі, якія ніколі не загаўкаюць. Трэба ўмець падрыхтаваць сабаку». Аляксандр раіць усім паляўнічым рыхтаваць парных сабак, бо гэта значна лягчэй, чым падрыхтаваць адзіночку. Ён добра ведае сітуацыю і лічыць, што ў Беларусі з сотні лаек-кабялёў толькі адзін здольны ісці на дзіка ў адзіночку. А ў сук наогул такая смелая паляўніца адна з пяцісот. Але гэта як у спорце: займаюцца ім многія, але вытрымліваць нагрузкі і сягаць на рэкордныя вышыні дадзена адзінкам. І хоць Барысёнак не праводзіць паралеляў гэтых розных стыхій жыцця, яму падабаецца імкненне да максімуму. Сам ён не аднойчы ставіў свае і біў чужыя рэкорды.

Нарадзіўся Аляксандр на Магілёўшчыне, побач са славутай гаспадаркай «Рассвет» імя Арлоўскага. Гэты факт з біяграфіі заўсёды быў падставай яго гонару. Таму і выбар першай прафесіі не стаў выпадковым. Скончыў Жыліцкі саўгас-тэхнікум, атрымаў дыплом агранома. Менавіта ў сярэднеспецыяльнай установе захапіўся спортам, палюбіў штангу, у ім заўважылі будучага пераможцу. Далейшай прыступкай адукацыі Барысёнка быў спартыўны факультэт Віцебскага педынстытута. Аляксандр з удзячнасцю прыгадвае свайго першага трэнера Леаніда Самусева, дзякуючы якому пачалася дарога ў вялікі спорт і ўдзелы ва ўсесаюзных чэмпіянатах. Пасля самастойна трэніраваўся ў Магілёве, затым 14 гадоў абараняў гонар Спартыўнага Клуба Арміі. Гэта быў самы плённы час у яго спартыўнай кар'еры. Станавіўся чэмпіёнам Савецкага Саюза, выйграваў Кубак Саюза. Але найбольш Барысёнак вядомы як экс-рэкардсмен свету ў штурханні штангі ў першай цяжкавагавай катэгорыі. Яго галоўны рэкорд — 241 кілаграм.

Але жыццё ў спорце, як вядома, хуткацечнае. Каму не хочацца заставацца запатрабаваным, захопленым мэтай, нечага дасягаць, калі энергіі і жаданняў яшчэ поўна? Толькі развал Саюза не пакідаў вялікіх шанцаў былым вайскоўцам і нават прызнаным спартсменам. Аляксандр не стаў чакаць манны нябеснай і пасля дэмабілізацыі закончыў гадавыя курсы бухгалтараў для колішніх ваенных у Самарскім універсітэце. Захапленне паляваннем (гэта яшчэ ад дзеда) паўплывала і на далейшы жыццёвы выбар. Ён вырашыў разводзіць норку, а заадно і паляўнічых сабак. Прывёз з Масквы першую заходнесібірскую лайку па мянушцы Астра і пасяліўся на Віцебшчыне — у вёсцы Літусава жылі яго сябры. Пабудаваў два шэды на 600 норак, знайшоў спецыялістаў, і з ранейшым спартыўным імпэтам пачаў фермерскую справу.



Мядзведзь таксама бывае сярдзіты, але толькі ў час спаборніцтваў лаек.

За яго плячыма ўжо васямнаццацігадовы вопыт працы з каштоўным звярком. На гаспадарскім падворку ўзведзены сучасная кармавая кухня і халадзільная камера, кацельня на абсталяванні для прыроднага газу, ёсць інтэрнат для працаўнікоў. Матачнае пагалоўе норкі даведзена ўжо да 2 тысяч, а ўсіх звяркоў на ферме амаль дванаццаць тысяч. Не так даўно гаспадарка Барысёнкаў папоўнілася новымі насельнікамі — козамі зааненскай пароды. Але гэта выбар і клопат жонкі Кацярыны — ветэрынара і заатэхніка па адукацыі. Аляксандру хапае ягоных лаек.

У каго на падворку сапраўды прывілеяваныя ўмовы — дык гэта ў сабак. Хоць і гэтая частка барысёнкавых насельнікаў хлеб дарма не есць. Лайкі выконваюць службу вартаўнікоў фермы. Часта гаспадар выводзіць іх на лясныя прагулкі ці давярае гэтую работу вясковым дзецям у час летніх канікулаў.

Пра сваіх выхаванцаў ён мог бы расказваць бясконца. Асабліва пра лайчыны дасягненні ў паляўнічых спаборніцтвах. Напрыклад, у 1995-м у яго быў кабель Буран — чэмпіён, першая сабака Расіі, а Гардан — заваяваў трэцяе месца на ўсерасійскіх спаборніцтвах. Бой і Вайс — палявыя пераможцы расійскага чэмпіянату. Цяпер у Барысёнка гадуецца новая зорка, ужо шматразовы чэмпіён па мянушцы Карнач — вынік шматгадовай селекцыйнай працы. У ёй Барысёнак набыў багаты вопыт і ягоныя парады будуць карыснымі любому, хто гэтак жа любіць і разумее лайку. Нават па трохдзённых шчанюках ён можа вызначыць, які з усяго вывадка будзе лепшы, мацнейшы.



З дапамогаю хатняга спартыўнага абсталявання колішні штангіст трымае сябе ў добрым фізічным стане.

«У радаводнай добрай лайкі павінна быць 36 сабак (каленаў). Па афарбоўцы, целаскладзе і антрапаметрыі (па вуглах) у шчанюку можна пазнаць яго пародзістага продка — дзеда ці прадзеда», — дзеліцца вопытам Барысёнак.

У 5-месячным узросце ён вядзе шчанюка ў вальер на дабрадушнага дзіка, падводзіць да клеткі з мядзведзем і правярае стаўленне да гэтых жывёл. Калі сабака не праяўляе інтарэсу, прыводзіць яго праз два месяцы. Калі лайка зноў не праяўляе цікавасці, аддае яе для палявання на пушнога звера — у Расіі шмат прыхільнікаў палявання на куніцу, вавёрку, норку, янота, на поўначы вядзецца собаль. Ад самага нараджэння сабака павінен паказваць, што ён — добры работнік. Толькі ў год яго бяруць у лес, глядзяць, каб не згубіўся, каб браў след.

«Каб паляўнічы мог навучыць маладога сабаку арыентавацца ў лесе, ён сам павінен вельмі добра засвоіць гэтую навуку», — робіць заключэнне Аляксандр. Бо і ў яго таксама калісьці не было вопыту і здараліся выпадкі, калі сабакі губляліся.

Інтэр'ер яго дома-гасцініцы нагадвае спартыўны музей — на сценах да самай столі дыпломы, медалі, кубкі. Не верыцца, што ўсе ўзнагароды належаць аднаму чалавеку. Зразумела, не для ўласнага самазадавальнення гаспадара яны тут красуюцца — для тых, хто ўпершыню пераступае парог, каб адчувалі наколькі ў гэтым доме паважнае стаўленне да сваёй справы. Кожная ўзнагарода — сведчанне вялікай працы, а працу трэба цаніць. Спартыўны снарад, які стаіць акурат пасярод пакоя з камінам, не з'яўляецца часткаю паляўнічага інтэр'ера, але тут зусім не лішні, ён дапамагае 51-гадоваму экс-рэкардсмену трымаць сябе ў добрым фізічным стане — даўняя добрая звычка. Хоць фізічнай нагрузкі яму хапае і без гэтага. Трэба шмат хадзіць па лесе, вучыць маладых лаек, рыхтаваць іх у сапраўдных паляўнічых. А падрыхтаваных і навучаных сабак ён часта раздае — у Барысёнка шмат сяброў. Ужо цяпер ён рыхтуецца да юбілейнага 15-га чэмпіянату, які пройдзе ўвосень наступнага года. Удзельнікаў чакае шмат прызоў і сюрпрызаў.



Шматлікія ўзнагароды — за спорт і за паляванні — гэта ўжо гісторыя і частка хатняга інтэр'ера.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**
*Сенненскі раён.*

**Купляй сваё — жыві лепш!**

## ВЫТВОРЧАСЦЬ ПІВА Ў БЕЛАРУСІ СКАРАЦІЛАСЯ

**(Заканчэнне. Пачатак на 4-й стар.)**

«Раней толькі «Крыніца» рэалізоўвала праз кіёскі амаль 30 працэнтаў піва, цяпер у прадпрыемства скараціўся аб'ём рэалізацыі праз дробную розніцу», — адзначылі ў канцэрне.

У студзені—кастрычніку гэтага года ў краіну было імпартавана 11,029 млн дал піва, што на 31,7 працэнта перавышае ўзровень аналагічнага перыяду 2007 года. Цяпер выпуск піва скарачаецца ў многіх еўрапейскіх краінах, у прыватнасці ў Чэхіі і ва Украіне, што звязана з сусветным фінансавым крызісам.

У агульным аб'ёме выробленага ў Беларусі за 11 месяцаў піва найбольшая доля прыпадае на ААТ «Крыніца» — 38,2 працэнта (у студзені—лістападзе 2007 года — 41,2 працэнта). На другім месцы ААТ «Піўзавод Аліварыя» з 18,2 працэнта (12,7 працэнта). Доля СЗАТ «ПК «Сябар» складае 13,4 працэнта (15,5 працэнта), ААТ «Лідскае піва» — 13,1 працэнта (12,3 працэнта), ААТ «Брэсцкае піва» — 8 працэнтаў (8,5 працэнта), СП «Рэчыцапіва» ААТ — 7,5 працэнта (8,2 працэнта), СТАА «Мінскае піва» — 0,5 працэнта (0,3 працэнта).

На ўнутраным рынку ў студзені—лістападзе гэтага года было рэалізавана 31,715 млн дал беларускага піва.

## «Тэхналогіі знішчылі айчынны каларыт»

**Ігар ЕМЕЛЬЯНОВІЧ, спецыяльны карэспандэнт радыёстанцыі «Сталіца» Белтэлерадыёкампаніі шэсць гадоў вёў радыёперадачу «З півам па жыцці»:**

— Яшчэ пару гадоў таму беларускае піва вылучалася нацыянальным каларытам. Яно выраблялася паводле класічных тэхналогій, са спакойным браджэннем на працягу 15-40 сутак у залежнасці ад гатунку. Было ў нас і «жывое» піва. Цяпер жа яно робіцца паводле замежных тэхналогій і па смаку наблізілася да таго ж расійскага і ўкраінскага. Я думаю, цяперашні спад цікавасці беларусаў да айчыннага піва абумоўлены толькі адным. У нейкі момант яно выраблялася з не самай якаснай сыравіны. У той жа час моцна актывізаваліся замежныя вытворцы, пайшла актыўная рэклама таго ж расійскага піва. І аматары напою пераключыліся на завезены прадукт. Народ паверыў у якасць не нашага піва. І цяпер, калі ў нас яно вырабляецца таксама паводле замежных, хуткасных — за 3-10 дзён — тэхналогій, ніхто ўжо не задумваецца, што розніца не надта відавочная. Нават наадварот, беларускае піва мае пакуль меншы тэрмін захоўвання, а значыць, у ім застаецца больш каштоўнага...



## НАША ПІВА ЛЕПШАЕ, БО ЖЫВОЕ

Спрачацца пра тое, якое піва лепшае — усё адно што абмяркоўваць вечныя пытанні з разраду «бландзінкі ці брунеткі», «аўтамабіль нямецкі ці любы іншы» і г.д. Піва павінна быць півам, а не вадкасцю з пэўным працэнтам алкаголю, адпаведным пахам і іншымі ўласцівасцямі. Ну якое, скажыце мне, піва можа быць з мацункам 9 градусаў, як балтыйская дзевятка? У піва ёсць тэхналогія, вытворчасць прадугледжвае строга абавязковыя кампаненты — солад, хмель, ваду. Усё астатняе — фірмовыя сакрэты, але яны спрацоўваюць, толькі калі арганічна дапаўняюць, шліфуюць смак. Я вось ужо некалькі гадоў аддаю перавагу «Аліварыі» — «Траецкае», ICE, «1864». Мне падабаецца смак жывога, непастэрызаванага піва, таму альтэрнатывы «Аліварыі» ў Мінску і не шукаю. А нефільтраваная разлівашка! Праўда, вельмі дарага. Розніца паміж жывым і кансерваваным півам прыкладна такая ж, як паміж салёнымі (не варанымі) рыжыкамі і кітайскімі дробнымі грыбкамі ў воцаце. Але ж нехта любіць і іх. Так і з півам.

Летам, праводзячы адпачынак у цесця на Магілёўшчыне, з задавальненнем ужываў «Баброў» — бабруйскую класіку: яно там больш свежае. «Аліварыя» туды не заўсёды даязджае, часта спрацоўвае мясцовы патрыятызм. Нічога не маю супраць! Цудоўна, калі ў кожным рэгіёне будзе свой адметны брэнд. Для нас, аматараў жывога прадукту, гэта важна — дзе б ні знаходзіўся, знойдзеш тавар на свой густ. Астатняе — проста штрыхі: піва можа называцца півам, калі яно халоднае і свежае.

Засмучае вось яшчэ што: кожная новая марка пачынае сваё шэсце з трыумфу, з выдатнай якасці, а ў працяг нярэдка ідзе зусім іншы напой. У чым тут справа? Тэхналогіі, хутчэй за ўсё, застаюцца ранейшымі. Магчыма, для раскруткі лініі выкарыстоўваюць якасную імпартную сыравіну, а потым пераходзяць на тое, што ёсць ці што танней купіць? Не варта хітрыць са сваім спажыўцом. І гэта датычыцца не толькі піва. Зараз у выйгрышы застанецца той, хто зробіць упор на якасць. Дарэчы, па выніках тых жа піўных продажаў з задавальненнем адзначыў: у іншых піваварaў прадаецца менш, а абраны мною завод працуе з добрым плюсам.

**Уладзімір ЗАЛУЖНЫ.** *г. Мінск.*

## Адзіная вартасць — кошт

— Беларускае піва звычайна моцнае, салодкае і вельмі падобнае на квас. Таму асабіста мне яно не падабаецца. «Аліварыя «Экстра» і «Белае золата» яшчэ можна піць. Раней было нядрэнным «Нікалаеўскае «Пілснер», таксама беларускае, аднак апошнім часам яго не відаць. Аддаю перавагу чэшскаму «Козел», падабаецца «Хью Гардэн» — белае бельгійскае, аднак яно ў разы даражэйшае за беларускае. Галоўная вартасць беларускага піва — яго таннасць... Увогуле традыцыйныя гатункі піва, якія выробляюць беларускія вытворцы, надакучваюць. Хочацца чагосьці новага, і тыя ж расійскія вытворцы прапануюць, напрыклад, маладое «Тубарг Грын», «Неўскае «Асе» — вымаражанае ці халоднай фільтрацыі. «Аліварыя», дарэчы, таксама імкнулася зрабіць нешта падобнае, не ведаю, ці атрымалася...

**Аляксандр КРАВЕЦ,** *г Мінск:*

**Анекдот у тэму**

— А якое піва самае лепшае?
— Тое, што выпадкова засталося на раніцу.




**Дарэчы**

## КАРЫСНАЕ, АЛЕ...

Піва, здольнае падоўжыць чалавечае жыццё, існуе. Ёсць толькі адно «але». Яно жудаснае на смак.

Піва з гучнай назвай «BioBeer» (бія-піва) зрабілі, як і абяцалі, студэнты Тэхаскага ўніверсітэта. У лячэбных мэтах яны ўвялі ў пеністы напой спецыяльныя піўныя дрожджы, якія ўтрымліваюць рэзвератрол. Гэта — моцны антыаксідант, які ўтрымліваецца ў цёмным вінаградзе і чырвоным віне і дапамагае змагацца са свабоднымі радыкаламі. Вучоныя лічаць, што менавіта яны адказныя за старэнне. Рэзвератрол таксама прадухіляе ўзнікненне сардэчна-сасудзістых захворванняў, дыябету, раку і хваробы Альцгеймера.

## ІМПАРТНАЕ ПІВА ЛЕПШ ПІЦЬ НА... ЯГО РАДЗІМЕ

**Піва я люблю. Асабліва халодненькае — падчас летняй спёкі. Ці пасля цяжкай фізічнай працы, калі пот з цябе цячэ, як кажуць, ручаямі. Аднавіць усё «вымытае» ім з арганізму атрымліваецца найлепш якраз з дапамогай пеннага напою. Аддаю перавагу светлым гатункам. Нейкіх асабліва любімых няма — пэўны час п'ю тое, што аднойчы паспытаў і яно спадабалася, напрыклад, навінку, але магу вярнуцца і да колішняга «фаварыта». Зараз з беларускага піва найчасцей п'ю «Баброва», зрэдку — «Крыніцу -1».**

Не толькі мной заўважана: калі нейкі гатунак толькі з'яўляецца ў продажы, ужываць яго — адно задавальненне. Але праходзіць месяц-другі і — куды падзелася ранейшая якасць, смак? Натуральна, у такім меркаванні шмат суб'ектывізму, але, паўтаруся, не я адзін так лічу. Асабіста ў мяне апошні такі выпадак быў з «Крыніцай — Экспартнай»: праз нейкі час смак напою мне ўжо не падаваўся такім добрым, як раней.

Цёмнае піва я п'ю (дакладней, піў) фактычна толькі за мяжой. Больш за іншае падабаецца чэшскае «тмавэ» — у сэнсе, цёмнае. Яго любяць нават жанчыны, якія піва дагэтуль у жыцці ніколі не пілі — з першага глытка. У тамтэйшага «тмавэ» карамельны смак.

Увогуле, імпартнае піва трэба з задавальненнем спажываць на яго радзіме — у той жа Чэхіі, Славакіі і г.д. Прывезенае адтуль дадому, яно нешта губляе па дарозе і ўжо не падаецца тым чароўным пенным напоем, які ты з асалодай піў у кавярні на старой брукаванай плошчы горада з відам на старажытны замак... І нават калі ты крыху «пазлоўжываў» тым півам, назаўтра, як не дзіўна, абсалютна не баліць галава. Хай сабе ты і «змяшаў» яго з «Абсалютам».

Імпартнае піва, і тут знаўцы сапраўды маюць рацыю, нельга ні ў якім разе піць пад салёную сушаную рыбу. Так, чыпсы, арэшкі... А ўжо пад наша можна «адцягнуцца», асабліва калі тую рыбу сам злавіў і засушыў. Вось напісаў гэта і адразу захацелася ў лета, у водпуск, на звыклае месца на рэчцы... Трэба будзе сёння пасля працы піва ўзяць — выпіць за будучы адпачынак, за лета, за рыбалку!

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

Перасцярога

## БЛЮЗ ПА ПАНЯДЗЕЛКАХ

**Як у розных краінах называецца пахмелле**

**10 месца: Рускі «бодун»:** у слоўніку Даля прыводзіцца наступнае значэнне гэтага слова: «скаціна, якая наважылася ўдарыць рогам альбо іншым тычком». Зараз гэтым словам называюць не жывёліну, а адпаведны стан чалавека.

**9 месца: Эстонцы** зрабілі проста — пазычылі ў суседзяў слова *pohmelus.*

**8 месца: Французы** п'юць да стану *«guelle de bois»* — «драўлянага рыла» ці «хворай ша вялюры» (mal aux cheveux).

**7 месца: Немцы** традыцыйна напіваюцца «да кацінага выцця» *(Katzenjammer)* альбо «шэрай бяды» *(das graue Elend).*

**6 месца: Партугальцы** адчуваюць моцную смагу: іх *«ressaca» перакладаецца як «адкат прыбою» (альбо «марскі адліў»),* іспанцы блізкія па сваіх адчуваннях. На іспанскай tener resaca — літаральна азначае «атрымаць іл, што вяртаецца прыбоем».

**5 месца:** У **нарвежцаў** раніцай пасля свята ўзнікаюць «цесляры ў галаве» *(jeghar tommermenn).*

**4 месца:** Музычныя **італьянцы** *дапіваюцца да stonato — «парушэння музычнага ладу» альбо spranghetta dopo la sbornia — «цяжкі стан пасля ап'янення».*

**3 месца: Англійскае** *the morning after — на наступную раніцу — і hangover* (сэнс слова, блізкі да нашага «наважыўся») найбольш блізкія да рускага «бодуна».

**2 месца:** У **Японіі** цяжкае пахмелле называецца амаль па-амерыканску- *«блюз па панядзелках»,* у той час як амерыканцы характарызуюць гэты стан як «гнеў вінаграду».

**1 месца:** Неперакладаемае **сербскае** *«мамурлюк»* усё ж можна трактаваць як «той, хто глядзіць на вас з люстэрка па раніцах». У **Мексіцы** пахмелле называецца el crudo (крудо) і ўжо нікім і ніяк даўно не перакладаецца.

*А як называюць такі стан беларусы? Відаць, найчасцей «беларуская хвароба смага». Як бы гэта ні называлася, варта памятаць: нічога прыцягальнага ў любой мове і ў любым перакладзе для апісання такога стану не існуе. Не забудзьцеся на гэта перад святамі!*

POST factum

## Крызіс размнажае мужчын-альфонсаў: ідзе паляванне на багатых жанчын

**Крызіс прымусіў мужчын успомніць, што яны па прыродзе паляўнічыя, вось толькі аб'ектам палявання сучасныя «мача» абралі жанчын — адзінокіх і забяспечаных. Сапраўднае паляванне на іх абвешчана ў Маскве, піша часопіс «Рускі Newsweek». Маскоўская міліцыя папярэджвае: у апошнія паўтара месяца прыкметна актывізаваліся альфонсы, якія хочуць перажыць цяжкія дні разам з якой-небудзь дамай, якая нядрэнна зарабляе.**



Псіхолагі пацвярджаюць: у бліжэйшыя месяцы для жыгала будзе раздолле. У крызіс забяспечаныя мужчыны пазбаўляюцца ад палюбоўніц — прыблізна гэтак жа, як ад няпрофільных актываў. Гэтыя кінутыя жанчыны першымі могуць апынуцца ў зоне рызыкі. Як кажуць у міліцыі, патэнцыйнай ахвяры зусім неабавязкова мець свой бізнэс або жыць на Рублёўцы. Ёсць сваё жыллё — падыходзячая кандыдатура. Раз'язджае на іншамарцы? Таксама нядрэнна — на бензін хапае, значыць, і мужчыну пракарміць зможа.

Для шматлікіх мужчын, якія засталіся без працы, кар'ера жыгала — адзіны спосаб зарабіць грошы, піша часопіс. «Адукаваныя менеджары аказаліся з-за крызісу ў складанай сітуацыі — на іх вісяць крэдыты, па якіх трэба плаціць, — лічыць псіхолаг Дзмітрый Сінараў. — І вырашыць гэтыя праблемы часта можна толькі за кошт жанчыны».

«У нас па-ранейшаму апрыёры лічыцца, што карміцель — мужчына», — кажа сацыёлаг Зоя Хоткіна з Маскоўскага цэнтра гендарных даследаванняў. Прызнавацца ў фінансавай безгрунтоўнасці мужчынам вельмі цяжка. А вось жанчынам браць на сябе ролю здабытчыка ў прынцыпе лёгка, упэўнена яна: у апошнія 15 гадоў у Расіі жанчыны сталі вельмі самастойнымі і даказалі гатоўнасць вырашаць чыста мужчынскія, здавалася б, задачы.

Даследаванне, праведзенае амерыканскай кампаніяй Prince&Associates, паказала: большасць багатых жанчын, якія ўтрымліваюць палюбоўнікаў, нават збіраюцца павысіць ім «ганарары» — маўляў, у свеце, дзе ўсё рушыцца, яны робяць стаўку на рамантыку. І альфонсам гэта вельмі на руку, робіць заключэнне выданне.

## Дзед Мароз у Польшчы ўкраў экскаватар, каб абмяняць яго на падарункі дзецям

**Польскі Санта Клаўс стаў зарабляць вымаганнем дзеля таго, каб даставіць радасць дзеткам прытулкаў. Кур'ёзнае злачынства адбылося ў горадзе Любліне, дзе ў нейкага Яраслава Крываноса, уладальніка экскаватара, укралі дарагую будаўнічую тэхніку, перадае агенцтва РІА «Навіны».**



Кошт выкрадзенага экскаватара — 4,5 тысячы долараў. Якое ж было здзіўленне пацярпелага, калі сам выкрадальнік патэлефанаваў яму праз некаторы час і адрэкамендаваўся Дзедам Марозам. Без лішняй сціпласці барадаты чараўнік прапанаваў вярнуць экскаватар на месца, але толькі ў абмен на своеасаблівы пераднавагодні выкуп. Зламыснік запатрабаваў купіць яму цацкі для дзяцей з люблінскага прытулку. Па тэлефоне Дзед Мароз удакладніў, што кошт падарункаў павінен быць не менш як 300 долараў. Пасля таго, як пан Крыванос выканаў гэтае патрабаванне, ён знайшоў свой экскаватар на ранейшым месцы. У паліцыі здзіўляюцца з нагоды выхадкі польскага Юрыя Дзетачкіна і рыхтуюцца да горшага. «Відаць, цяпер для эканомікі надышлі вельмі цяжкія часы, калі нават Санта спрабуе свае сілы ў крадзяжы», — адзначыў адзін з паліцэйскіх.

Нагадаем, што падобная гісторыя стала сцэнарыем вядомага савецкага фільма «Беражыся аўтамабіля» з Інакенціем Смактуноўскім і Алегам Яфрэмавым у галоўных ролях, у якім выкрадальнік Юрый Дзетачкін здзяйсняе злачынствы дзеля таго, каб дапамагаць дзецям.

## Расійскія бяздомныя прайгралі чэмпіянат свету па футболе

**Зборная расійскіх бяздомных прайграла чэмпіянат свету па вулічным футболе, які праходзіў у аўстралійскім Мельбурне. У фінале расіяне саступілі камандзе Афганістана з лікам 4:5.**

Для афганскіх бяздомных гэтая перамога стала першай на чэмпіянаце. Трэцяе месца заняла каманда Ганы. Усяго ў чэмпіянаце свету 2008 года ўдзельнічалі 48 камандаў. Расійскія бяздомныя выйгравалі чэмпіянат свету ў 2006 годзе, акрамя таго, двойчы яны становіліся пераможцамі і на першынстве Еўропы. Чэмпіянаты такога ўзроўню праходзяць на полі памерам 16 на 22 метры. Працягласць матча складае 15 хвілін. Расію на турніры прадстаўляла каманда пецярбургскай вулічнай газеты «Шлях дадому». Наступны чэмпіянат свету пройдзе ў верасні наступнага года ў Мілане.






## СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




## Беларусы ўбачаць выбары новай «Міс свету»

Фінал 58-га міжнароднага конкурсу прыгажосці «Міс свету» адбудзецца 13 снежня ў «фінансавай сталіцы» Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі — Йоханесбургу. Сёлета ў нежартоўнай барацьбе за званне першай прыгажуні сышліся дзяўчаты са 112 краін свету, у тым ліку і з Беларусі. Нашу краіну на конкурсе прадстаўляе пераможца нацыянальнага конкурсу «Міс Беларусь-2008» Вольга Хіжынкова.

Канкурсанткі прыбылі ў ПАР амаль месяц таму, 16 лістапада, і адразу апынуліся ў віхуры падзей. Праграма чатырохтыднёвага тура дзяўчат па краіне ўключала фотасесіі, рэпетыцыі, інтэрв'ю, дабрачынныя акцыі, экскурсіі... А таксама прамежкавыя спаборніцтвы за тытулы «Міс пляж», «Міс топ-мадэль», «Міс спорт», «Міс талент» ды іншыя, якія аўтаматычна даюць сваім уладальніцам месца ў паўфінале. Гэту ж перавагу над саперніцамі мае пераможца інтэрнэт-галасавання, якое праходзіць на афіцыйным сайце конкурсу. Аднак пакуль што інтрыга наконт канчатковага складу групы лідараў захоўваецца (у фінал трапляюць 15 дзяўчат, 6 — па выніках прамежкавых этапаў, 9 выбірае журы). Шанц трапіць у лік фіналістак мае і Вольга Хіжынкова — дарэчы, яна самая высокая сярод сёлетніх канкурсантак. Вядома, што для фінальнага выхаду наша ўдзельніца падрыхтавала сукенку з серабрыста-блакітнага шоўку, з хрустальным упрыгажэннем і карункамі ручной работы, спецыяльна створаную для конкурсу брэсцкай фірмай Papilio.

Грандыёзнае шоу «Міс свету-2008» пройдзе ў цэнтры «Sandton Convention Centre», дзе звычайна адбываюцца розныя модныя паказы і прэстыжныя выстаўкі. Рэпартаж з конкурсу ўбачаць і беларусы — тэлеверсію яго пакажа канал АНТ, прычым каментаваць падзеі будуць выключна мужчыны: Арташэс Антанян, Іван Вабішчэвіч, Сяргей Хоміч і Ягор Хрусталёў.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.18 | 15.48 | 7.30 |
| Віцебск — | 8.15 | 15.30 | 7.15 |
| Магілёў — | 8.08 | 15.38 | 7.30 |
| Гомель — | 7.57 | 15.43 | 7.46 |
| Брэст — | 8.32 | 16.04 | 7.32 |
| Гродна — | 8.24 | 16.13 | 7.49 |

**Месяц**

***Першая квадра. Месяц у сузор'і Блізнятаў.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Аляксея, Васіля, Івана, Мікалая, Пятра, Рыгора, Сцяпана, Фёдара.* ***К.*** *Дануты, Клары, Сабіны, Даніэля, Сцяпана.*



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.




...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +3..+5°С | КІЕЎ +1..+3°С | РЫГА 0..+2°С |
| ВІЛЬНЮС +2..+4°С | МАСКВА -1..+1°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ -3..-1°С |

## Дзве даты

**11 снежня**

**1920 год** — у БССР была створана Надзвычайная камісія па ліквідацыі непісьменства. У 1921—1922 гадах у школах для непісьменных у рэспубліцы займалася каля 12,5 тысячы чалавек. У ліквідацыі непісьменства актыўна ўдзельнічалі так званыя культармейцы — рабочыя, інтэлігенцыя, навучэнцы. Непісьменства сярод дарослага насельніцтва ў БССР у асноўным была ліквідавана да 1932 года.



**1936 год** — англійскі кароль Эдуард VIII адмовіўся ад трона з-за кахання да двойчы разведзенай амерыканскай актрысы Уоліс Уорфілд-Сімпсан.

## Цытата дня:

***«Паэзія гаворыць больш, чым проза — пры дапамозе меншай колькасці слоў».***

**Вальтэр (1694—1778), французскі пісьменнік.**

## Інфарм-укол

### СУПРАЦЬ МІКРОБАЎ — ТРАВА АРЭГАНА

У барацьбе з мікробамі дапамогуць такія травы як душыца, базілік, чабор і некаторыя іншыя.

Англійскія і індыйскія вучоныя даследавалі такую траву, як арэгана. Вядома, што яна ўтрымлівае шмат духмяных рэчываў, адно з якіх — карвакрол — забівае не толькі многія мікробы, але і некаторых паразітаў — дробных глістоў, якія жывуць у тонкім кішэчніку і жоўцевым пухіры. Даследчыкі параўналі дзеянне эфірных алеяў арэгана з 18 самымі папулярнымі антыбіётыкамі і пераканаліся, што трава забівае нават устойлівыя да лекаў мікробы.

### АД ГІПЕРТАНІІ — УСІМІ СІЛАМІ

70 працэнтаў амерыканцаў з дыягнаставанай гіпертаніяй не прымаюць належных мераў для кантролю артэрыяльнага ціску.

Паводле атрыманых звестак, 98 апытаных гіпертонікаў імкнуцца змагацца з хваробай, але робяць для гэтага толькі некалькі крокаў. Так, 70 працэнтаў мяняюць харчовыя звычкі, 80 — скарачаюць колькасць солі, яшчэ 80 — устрымліваюцца ад алкаголю, 70 — займаюцца фізкультурай, 73 — прымаюць адпаведныя прэпараты. У выніку толькі 30 працэнтаў хворых пераадольваюць гіпертанію. Паводле ж слоў медыкаў, пры гэтым захворванні неабходна вытрымліваць усе медыцынскія рэкамендацыі разам, а не паасобку. Правільнае харчаванне, фізічная актыўнасць, адмова ад курэння, пазбяганне стрэсу, сістэмнае ўжыванне лекавых прэпаратаў — асновы папярэджання і лячэння гіпертаніі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

Наўздагон

# «ВАДА ДЗІРАЧКУ ЗНОЙДЗЕ..?»

Тэлефануе мая сяброўка, якая працуе доктарам у бальніцы. «Уяўляеш, гаворыць, нас правяраюць. Калі прыходзім-сыходзім з работы, ці не спазняемся з абедзеннага перапынку...» У той жа вечар аналагічныя размовы адбыліся са знаёмымі, якія працуюць у выканкаме, універсітэце, на тэлефоннай станцыі... Народ насамрэч перапалохаўся і будзе заўсёды хадзіць на працу без спазнення?

Мэта кантралюючых зразумелая і ніхто не адважыцца яе аспрэчваць. Дысцыпліна павінна быць у любым калектыве. Аднак, я памятаю татальныя аблавы ў магазінах і кінатэатрах, якія праводзіліся ў 80-х, пры Андропаве. Тыя акцыі крыху напужалі звычайнае насельніцтва, але ж ці выхавалі дысцыпліну? Тым часам размова, здаецца, ідзе не аб дысцыпліне дзеля дысцыпліны, а аб марнатраўстве рабочага часу.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Я папрасіла сваіх знаёмых расказаць (зразумела, па сакрэце), як можна «валяць дурня», знаходзячыся на працы. Безумоўна, у кожнай галіне ёсць свае прафесійныя асаблівасці. І таму зараз размова аб найбольш распаўсюджаных спосабах.**

• **Першы назвалі, бадай, усе: разгадваць красворды, сканворды, судоку.** Варыянт — чытаць газеты: анекдоты, рэцэпты, гараскопы, зводкі надвор'я, парады па пахудзенні... І ў мяне быў знаёмы кіраўнік, якога я бачыла толькі за чытаннем свежай прэсы — на апошняй старонцы.

*Калі супрацоўнік павінен адбыць ад 9 да 18, а сваю непасрэдную працу робіць хутка і добра, чаму б не «праветрыць» мазгі інтэлектуальнай забаўкай. Мала каму ў галаву прыйдзе прасіць работу дадаткова: раптам могуць і даць.*

• **Рэкламныя часопісы.** Ніхто не ведае, адкуль яны з'яўляюцца на сталах, пасля чаго на гадзіну забываюцца нават тэрміновыя фінансавыя справаздачы. Жанчыны не толькі абмяркоўваюць суадносіны цаны і паху, ім не лянотна будзе прабегчыся па ўсіх сямі паверхах, каб расказаць знаёмым, што менавіта цяпер дзейнічаюць суперскідкі на крэм супраць маршчын. Студэнткі на занятках уяўляюць сябе ў якасці мадэляў, а на перапынках паспяхова распаўсюджваюць нятанную прадукцыю касметычных фірмаў сярод тых, каму не хапае грошай на піражок.

*Можа, кіраўнік хоча, каб яго падначаленыя выглядалі, як Кацярына Пушкарова ў першых серыях «Не нарадзіся прыгожай»? Як гэта можа адбіцца на кліентуры фірмы? Ну а для студэнтаў гэта рэальны шанц зарабіць рэальныя грошы.*

• **Пайшоў на тэрыторыю (на аб'ект).** Звычайна такую фармулёўку можна пачуць ад сакратарак кіраўнікоў прадпрыемстваў — буйных і не вельмі. Дзе знаходзіцца тая тэрыторыя — на Паўднёвым ці Паўночным полюсе, не даведацца, пры наяўнасці добрай памочніцы, нікому і ніколі. Ну а мабільны тэлефон можна выпадкова забыць у кабінеце, у яго можа сесці батарэя і гэтак далей... Па маіх назіраннях, «на тэрыторыю» кіраўнікі сыходзяць заўсёды ў другой палове пятніцы і вяртаюцца адтуль толькі ў панядзелак.

*Калі кіраўнік сапраўды толькі ў кабінеце штаны працірае, ці будзе плённай яго праца?*

• **Цыгарэта.** Здаецца, гэта не толькі спосаб стратэгічна пашкодзіць бясцэннае здароўе, адпачыць і перавесці дух на працы (нездарма ж узнік выраз — «перакур»), але ж і магчымасць у дэталях абсмактаць усе плёткі. Калі ты выпадкова трапляеш у такую кампанію, асабліва востра адчуваеш, як шмат гаворкі пра тое, пра што ўвогуле не трэба было б гутарыць — ніколі...

*Можа, у нас недастаткова культуры правядзення вольнага часу ўвогуле і перапынкаў у прыватнасці? Яны ж патрэбныя — менавіта для таго, каб нармальна працаваць далей... Некалькі сталоў для тэнісу або більярду маглі б вырашыць праблему.*

• **Кубачак кавы.** Відаць, справа не ў каве, а ў яе колькасці. Кубачкаў за працоўны дзень рэальна можа быць куды больш, чым дзесяць! У перапынках паміж кавай можна мераць ціск і здзіўляцца, што высокі. А потым зноў прайсціся па кабінетах, сумяшчаючы цудоўны напой з перамываннем костачак калегам. А чаму не — вадзічка дзірачку знойдзе, — адказваюць сябры.

*10 гадоў таму ў Даніі мне давялося пабываць у рэдакцыях многіх газет, радыё і тэлебачання. Каву, гарбату і нават піва — на выбар, як штогадзінныя напоі прапаноўвалі нам і пілі самі нашы калегі-журналісты. Сапраўды, адразу цяплее ўнутры, калі табе прапануюць раздзяліць сціплую трапезу...*

• **Камп'ютар сябар, камп'ютар вораг.** Любімы занятак для ламераў (тых, хто крыху адрознівае сістэмны блок ад манітора) — раскладваць пасьянсы на камп'ютарным стале. Што датычыцца геймераў (гэта прыхільнікі куды больш складаных гульняў), у многіх арганізацыях і прыватных фірмах сістэмныя адміністратары час ад часу праводзяць «чыстку» разумных машын, якія супрацоўнікі захламліваюць з зайздроснай упартасцю. Агульнавядомыя сайты, што дапамагаюць знайсці даўніх знаёмых і на доўгі час выключаюць з рэальнага свету вельмі многіх. Прынамсі, церпяць і ад аматараў порнаклубніцаў. Сісадміны нарэшце сталі блакаваць выхад на віртуальныя спатканні з колішнімі і новымі сябрамі. Усім, акрамя выбраных... Тым часам простыя смяротныя амаль незаўважна для калег на форумах абмяркоўваюць дзейнасць палітыкаў, у блогах каментуюць артыкулы, перапісваюцца ў «асьцы» і гэтак далей па меры ўдасканалення тэхналогій...

*Уявіць жыццё без камп'ютара сёння проста нельга. Без інтэрнэту — амаль што таксама. Можа, справа не ў іх адсутнасці ці наяўнасці, а ў нашых узаемаадносінах з гэтым настольным цудам? Некаторыя чытаюць кнігі і слухаюць музыку — з дапамогай таго ж камп'ютара. Ці дарэмна яны праводзяць час, яшчэ вялікае пытанне. Адна мая калега ў чатах паспяхова чэрпае тэмы для сваіх артыкулаў. Іншыя маюць дадатковы, і нядрэнны, заробак у віртуальнай прасторы. Калі высокія тэхналогіі забіраюць наш час, чаму б ім не дапамагчы ў адваротным? Ёсць камп'ютарныя праграмы-плоніроўшчыкі, што нагадваюць справы, якія патрэбна зрабіць, тэлефоны, факсы, электронныя адрасы... Сёння можна карыстацца разумнай машынай як друкавальнай машынкай, а можна з яе дапамогай пазбаўляцца ад лішніх папер.*

*Адзінае, што магчыма зрабіць з часам, які мы затрачваем на працу, гэта скараціць яго за кошт павелічэння прадуктыўнасці. Ну, напрыклад, авалодаць сляпым дзесяціпальцавым метадам набору тэксту. Ці хоць бы пачаць выкарыстоўваць замест «мышкі» кнопкі «Ctrl», «Alt», «Caps Lock», «Home», «End», і гэтак далей на клавіятуры. Ведаю на асабістым вопыце, наколькі хутчэй выконваецца любая работа.*

Больш чым паўстагоддзя таму нарадзіўся цэлы навуковы накірунак, закліканы дапамагчы нам арганізаваць сябе. Вывучэнне законаў моднага сёння тайм-менеджменту нагадвае сітуацыю з пахудзеннем. Як з вагой, з часам можна змагацца ў тэорыі. Але на практыцы праблема яе недахопу, як і лішнія кілаграмы, застануцца.

**Можна пільна кантраляваць прыход-сыход, але ж грамадзяне ўсё роўна будуць незадаволеныя чыноўнікам (доктарам, настаўнікам, юрыстам), якому «да лямпачкі» сапраўдная праблема звычайнага чалавека. У незалежнасці ад таго, згорнуты ці разгорнуты на яго камп'ютарным стале пасьянс.**

**Ці будзе пэўны вынік пры вырашэнні канкрэтнага пытання, залежыць, як заўсёды, толькі ад сумлення. Калі з ім усё добра, перашкодай не будуць ні кубачак кавы, ні камп'ютар, ні нават рэкламны часопіс...**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ДЛЯ ПЛАДАВІТАСЦІ...

Свет і сусвет чалавека

**Супраць бясплоднасці даволі часта выконваліся магічныя дзеянні, у якіх самы актыўны ўдзел «бралі» садовыя і лясныя дрэвы, палявыя і лугавыя расліны. Так, бясплоднай жанчыне раілі з'есці почкі пладовага дрэва (грушы ці яблыні), якое заквітнела ўпершыню. Пільнавалі першы плод на гэтым дрэве, каб яго з'ела менавіта такая жанчына. На Палессі раілі з'есці грушу, якая болей за іншыя правісела на дрэве.**

• У абрадавых песнях, каб зацяжарыць, маладухам раілі паесці гарохавай кашы. Існаваў славянскі казачны сюжэт аб нараджэнні асілка па імені Пакаціғарошак, які з'яўляецца яскравым таму сведчаннем.

• Наяўнасць у дуба жалудоў набліжала яго да пладовых дрэў. Бясплодныя жанчыны «хадзілі да дуба і прасілі ў лясного духа дзяцей». У надзеі зацяжарыць бясплодная жанчына павінна была пралезці праз шчыліну ў дубе.

• Усходнія славяне прыпісвалі вярбе здольнасць вярнуць пладаноснасць. У старажытныя часы жанчыны прыходзілі да вярбы і маліліся, каб яна падаравала ім доўгачаканых дзяцей, спадзеючыся, што вярба перадасць сваю пладаноснасць чалавеку. У літоўцаў існавала паданне, што ў вярбу была ператворана жанчына Блінда, якая мела дар пладавітасці і нараджала дзяцей надзвычай лёгка. Аднойчы Зямля, самая пладавітая з усіх маці, пазайздросціла ёй і ператварыла ў куст.

• Народныя лекары раілі бясплодным жанчынам есці пупышкі асвечанай у Вербную нядзелю вярбы, а на Вялікдзень плесці пояс з галінак вярбы і насіць на працягу сарака дзён.

• Каліна, яе ягады, лісце, кара былі надзейным сродкам пры сэксуальных расстройствах і жаночых захворваннях. У дзень святой Акуліны (7 красавіка) бясплодным жанчынам трэба было піць адвар з ягад каліны, якія бралі з вянка нявесты, і маліцца святой аб даранні дзіцяці.

• Сімвалам пладавітасці ва ўсходніх славян, перш за ўсё, былі зернебабовыя культуры. На вяселлі жаніха і нявесту пасыпалі жытам. Колькасць зярнят, якія «прычапіліся» да адзення, прадказвала колькасць дзяцей ці іх адсутнасць.

• Нявесту перад тым, як яна паедзе ў храм пад вянец, саджалі на хлебную дзяжу.

• Каб нарадзіць доўгачаканае дзіця, жанчыне неабходна было насіць пры сабе дзевяць зярнятак жыта, сабраных з дзевяці падворкаў.

• Каб у нявесты нараджаліся сыны, у Беларусі існаваў звычай, згодна з якім яна ў час вянчання павінна была трымаць за пазухай арэх.

• Для таго каб стаць бясплоднай, г.зн. больш не раджаць, жанчыны таксама выкарыстоўвалі некаторыя магічныя дзеянні. Пасля чарговых родаў жанчына ўкладвалася на разасланую папараць і закапвала плацэнту пад таполяй, якая лічылася ў народнай культуры бясплодным дрэвам, таму што на ім ніколі няма пладоў.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Усміхнёмся!

☺

Едзе мужык дадому на машыне, раптам раз — на дарогу выскоквае заяц. Мужык па тармазах, руль выкруціў — ледзь-ледзь аб'ехаў. Едзе далей, раз — на дарогу алень выбягае, мужык, зразумела, і зноў тормаз у падлогу — перад самым аленем спыніўся. Едзе далей, а тут на дарогу — МЯДЗВЕДЗЬ! Мужык па тармазах, але зрабіць ужо нічога не можа, бабах, машына дашчэнту, мядзведзь дохлы валяецца. Мужык выпаўзае з разбітай машыны і кажа:

— Блін, трэба было зайца душыць...



☺

**— Мішачка, Міша, ну навошта ж ты коніку вусны ў чырвоны колер пафарбаваў?**

**— Яна — жанчына.**

**— А навошта вушы ў сіні?**

**— Яна змерзла!**


ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА I КВАРТАЛ І ПЕРШАЕ ПАЎГОДДЗЕ 2009 ГОДА З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ

Местное самоуправление. Свая справа. Чырвоная змена. Купі лепшае! Жыцця доля. Краіна здароўя. Нашчадкі Чарнобылю.

| | | |
|---|---|---|
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 10 120 рублёў на месяц<br>30 360 рублёў на квартал<br>60 720 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 9 570 рублёў на месяц<br>28 710 рублёў на квартал<br>57 420 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 16 170 рублёў на месяц<br>48 510 рублёў на квартал<br>97 020 рублёў на паўгоддзе |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 14 740 рублёў на месяц<br>44 220 рублёў на квартал<br>88 440 рублёў на паўгоддзе |
| ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ» (праз кіёскі Мінгарсаюздруку) | | |
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 8 690 рублёў на месяц<br>26 070 рублёў на квартал<br>52 140 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 8 180 рублёў на месяц<br>24 540 рублёў на квартал<br>49 080 рублёў на паўгоддзе |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 11 640 рублёў на месяц<br>34 920 рублёў на квартал<br>69 840 рублёў на паўгоддзе |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 11 010 рублёў на месяц<br>33 030 рублёў на квартал<br>66 060 рублёў на паўгоддзе |



ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

**Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.**

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by



Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.



Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.333 Індэкс 63850. Зак. № 6864. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12